ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



**За кулісамі ЦТ**



**«Партал» у самастойнасць**



**Часопісу «Вясёлка» — 60!**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Сяргей ПАПКОЎ, міністр сувязі і інфарматызацыі:**

*«Інтэрнэт рэчаў — новы этап развіцця сеціва, які значна пашырае магчымасці збору, аналізу, распаўсюджвання і атрымання даных. У гэтым сэнсе інтэрнэт рэчаў набывае вялікае значэнне. Спалучэнне паўсюднага падключэння да сеткі недарагіх датчыкаў і простай электронікі дасць магчымасць падключаць да інтэрнэту літаральна ўсё — ад халадзільніка да электраэнергетычных сістэм. Усе сферы жыцця сёння адчуваюць на сабе ўплыў новых тэхналогій».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.04.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8799 | ▲ |
| Еўра | 2,0162 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0334 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0701 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 КРАСАВІКА 2017 г. ЧАЦВЕР № 75 (28439)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Пад гербам «Ліс»



**У Мсціславе з'явіўся свой абярэг у выглядзе скульптуры лісы. Аўтар кампазіцыі магіляўчанін Андрэй ВАРАБ'ЁЎ, удзельнік пленэру скульптуры, які прайшоў перад мінулагоднім абласным святам Дажынак, назваў сваю работу «Захавальнік гісторыі Мсціслава». І не выпадкова. Бо на старажытных і сучасных гербах горада ліса з'яўляецца галоўным сэнсавым персанажам. Мсціслаўцы адразу палюбілі гэты сімвал і вераць, што, дакрануўшыся да пыскі бронзава-латуневага драпежніка, атрымаеш удачу.**

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

■ Глыбінка

## КІНО ЗА... 30 КАПЕЕК

**Карэспандэнт «Звязды» высветліў, наколькі выгадна «круціць кіно» ў глыбінцы.**

У Талачынскім раёне кінапракатчыкі другімі пасля Віцебска перайшлі на паказ фільмаў у 3D-фармаце.

— Сёлета нашаму кінатэатру «Колас» — 50 гадоў. «Аб'ёмнае» кіно з'явілася ў кінатэатры пасля рамонту пазалетась. У зале 280 месцаў. Толькі на «лічбу» патрацілі каля 2 мільярдаў рублёў (сума — да дэнамінацыі). Плюс нямала — на рамонт, светлавое і гукавое абсталяванне для правядзення канцэртаў, шоу, — расказвае **Ірына РАВЯКА, дырэктар раённай кінавідэасеткі** *(на фота)*.



У кінатэатры ахвотна выступаюць зоркі эстрады. У прыватнасці, калі рыхтаваўся гэты рэпартаж, толькі пяць білетаў засталося на сольны канцэрт Аляксандра Саладухі. Цана задавальнення — 10–12 рублёў. Раней з аншлагам спела Ларыса Грыбалёва...

**СТАР. 5**

■ Замалёўкі з жыцця

## НЕ АДЫХОДЗЯЧЫ АД КАСЫ, ДАКЛАДНЕЙ — АД МЕТРО

### Чаму мінчане не хочуць адмаўляцца ад несанкцыянаванага гандлю?

**У вялікіх гарадах станцыі метро, асабліва цэнтральныя або канцавыя, з'яўляюцца засяроджаннем усяго жыццёвага «руху»: арэндадаўцы абавязкова ўказваюць адлегласць да найбліжэйшага прыпынку падземкі, жыхары далёкіх спальных раёнаў марацць пра тое, каб гэты від транспарту хутчэй дабраўся і да іх, а буйныя супермаркеты змагаюцца за права размясціцца побач. Аднак усе яны — не адзіныя, хто спрабуе выбіць сабе «месца пад сонцам» паблізу ўваходу ў метро. У справу ўступаюць і дробныя «прадпрымальнікі» — стыхійныя гандляры.**

### «А можна памацаць?»



Фота Надзеі БУЖАН.

«Каменная Горка» — адна з самых загружаных станцый метро ў Мінску, а значыць, і найбольш прыцягальных у вачах вулічных гандляроў. Да таго ж, не ў цэнтры, а значыць, і кантроль тут не такі жорсткі. Гэта вам не на «Кастрычніцкай» кроп з пятрушкай раскласці. «Дзякуючы» гэтаму пляцоўка каля выхаду з метро пастулова ператварылася ў сапраўдны міні-рынак, у якім нават намецілася некалькі гандлёвых радоў.

«Прывабныя прапановы» пачынаюць «сыпацца» на пасажыраў яшчэ ў пераходзе. «Плед, цёплы, усяго 15 рублёў. Апошні застаўся», — натрэніраваным вокам прадаўшчыца выглядвае ў натоўпе тыпаж сваёй патэнцыйнай пакупніцы. Выглядвае і трапляе «ў дзясятачку»: побач з ёй спыняецца стомленая жанчына гадоў 55. «А ён вялікі? Можна памацаць?» Не праходзіць і дзвюх хвілін, як здзелка завершана. Пасля чаго адна з іх ужо значна больш бадзёрым крокам накіроўваецца на аўтобусны прыпынак, другая таксама сыходзіць, але толькі для таго, каб папоўніць запасы «апошніх» пледаў, абрусаў і камплектаў пасцельнай бялізны.

**СТАР. 4**

## Заўтра Прэзідэнт звернецца з Пасланнем да народа і парламента

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 21 красавіка звернецца са штогадовым Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу.**

Выступленне кіраўніка дзяржавы адбудзецца ў час сумеснага пасяджэння Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Прамую трансляцыю з Авальнай залы Дома ўрада будуць весці тэлеканалы «Беларусь 1» і «Беларусь 24», а таксама Першы нацыянальны канал Беларускага радыё. Трансляцыя пачнецца ў 10.00. Тэлевізійную версію Паслання пакажуць у вячэрнім эфіры беларускіх тэлеканалаў.

На мерапрыемства запрошаны вышэйшыя службовыя асобы краіны, члены ўрада, кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, найбуйнейшых прадпрыемстваў і сродкаў масавай інфармацыі, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса.

■ Парламенцкі дзённік

# БЯСПЕКА, СПОРТ І АЗАРТНЫЯ ГУЛЬНІ

### Дэпутаты прынялі чарговы пакет законапраектаў

**Праз учарашняе пасяджэнне Палаты прадстаўнікоў чырвонай ніткай праходзіла тэма бяспекі і процідзеяння тэрарызму і экстрэмізму. Гэтаму прама ці ўскосна прысвечаны тры законапраекты.**

## Без пралазаў для тэрарызму

**Першы намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Ігар СЕРГЯЕНКА** прадставіў праект закона, прысвечаны барацьбе з тэрарызмам. Уводзіцца адказнасць за фінансаванне праезду да месца навучання тэрарыстычным дзеянням, тлумачыцца тэрмін «крытычна важныя аб'екты», удасканальваецца механізм прызнання арганізацыі тэрарыстычнай — гэта толькі некаторыя новаўвядзенні ў нарматыўную базу. Адказваючы на пытанне **дэпутата Аляксандра МАРКЕВІЧА** пра крытычна важныя аб'екты, прадстаўнік КДБ паведаміў, што такіх у нас вызначана каля 850. Што да самога тэрміна, то пад ім трэба разумець «аб'екты сацыяльнай, вытворчай, інжынерна-транспартнай, энергетычнай, інфармацыйна-камунікацыйнай і іншай інфраструктуры, парушэнне функцыянавання якіх у выніку актаў тэрарызму можа садзейнічаць дэстабілізацыі грамадскага парадку і дасягненню іншых мэт тэрарызму, пацягнуць за сабой чалавечыя ахвяры».

— Гэтае азначэнне ўжо замацавана ў Канцэпцыі барацьбы з тэрарызмам у Рэспубліцы Беларусь, а таксама ва Указе Прэзідэнта аб Камісіі па процідзеянні экстрэмізму і барацьбе з тэрарызмам. У прыватнасці, такія камісіі ўжо створаны і працуюць: шэсць абласных і Мінская гарадская. Менавіта гэтыя камісіі ўносяць аб'екты ў спіс крытычна важных, — расказаў Ігар Сергяенка.

## Спорт без рызыкі

Тэма бяспекі — ключавая і ў законапраекце «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях аховы грамадскага парадку і забеспячэння грамадскай бяспекі пры правядзенні спартыўна-масавых мерапрыемстваў, спартыўных спаборніцтваў». Не так даўно «Звязда» ўжо пісала пра тое, што балельшчыкам, якія хуліганілі падчас, напрыклад, спартыўных матчаў, могуць забараніць на пэўны тэрмін наведваць спартыўныя мерапрыемствы.

**Ігар НЕВАР, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы**, выступіў судакладчыкам па праекце закона, што ўносіць змяненні і дапаўненні ў Закон «Аб фізічнай культуры і спорце». Як расказаў парламентарый, вялікая ўвага ў новым дакуменце таксама надаецца пытанням як грамадскай бяспекі, так і бяспекі спартсменаў любога ўзроўню: ад міжнароднага класа да дзіцяці, якое займаецца спортам.

— Упершыню на заканадаўчым узроўні мы прымянілі новыя тэрміны, такія як балельшчык, сцюард, валанцёр, — паведаміў Ігар Невар. — І гэта дало магчымасць на практыцы абараніць правы балельшчыкаў і ў той жа час вызначыць правы і абавязкі валанцёраў, сцюардаў у сувязі з тым, што мы ўдзельнічаем у міжнародных спаборніцтвах.

## Сам сабе рэгламент

Цікавыя змены дэпутаты прынялі ў першым чытанні ў Грамадзянскі працэсуальны кодэкс. Яны прысвечаны абароне насельніцтва ад негатыўнага ўздзеяння азартных гульняў. Так, чалавек, які мае гульнявую залежнасць, можа самастойна абмежаваць для сябе наведванне гульнявых устаноў на тэрмін ад шасці месяцаў да трох гадоў. Для таго каб зрабіць гэта, трэба падаць пісьмовую заяву арганізатару азартных гульняў. Калі ж гульнявая залежнасць ставіць у цяжкае матэрыяльнае становішча цэлую сям'ю, то чалавека могуць абмежаваць у наведванні адпаведных устаноў — ужо па рашэнні суда. Правы звярнуцца з такой заявай у суд дадзена блізкім родзічам залежнай асобы.

**Дэпутат Тамара КРАСОЎСКАЯ** прапанавала павялічыць узрост асоб, якія дапускаюцца да наведвання гульнявых устаноў. Парламентарый аргументавала, што ў 18-гадовым узросце далёка не ўсе разумеюць, наколькі сумнымі могуць быць наступствы ад празмернага ўдзелу ў азартных гульнях. Прадстаўнік МПЗ паведаміў, што адпаведнае пытанне ўжо не раз абмяркоўвалася, але падобныя абмежавальныя меры паўналетнія грамадзяне трактуюць як парушэнне іх правоў і свабод.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by* ■

■ Тры пытанні да ўлады

# ЯК НАВАПОЛАЦК СТВАРАЕ ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ

**Аб тым, як працуюць службы любога горада, можна меркаваць па зваротах грамадзян. Як правіла, менавіта пасля асабістых прыёмаў у выканкамах вырашаецца фактычна любая праблема. І ўсё ж такі бываюць паўторныя звароты, а бывае і так, што па аб'ектыўных прычынах той жа капрамонт не можа быць зроблены «ў наступным месяцы»... На Віцебшчыне традыцыйна лідзіруючыя пазіцыі па агульным сацыяльна-эканамічным паказчыку займае Наваполацк. Старшыня Наваполацкага гарадскога выканаўчага камітэта Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ тлумачыць, як ён працуе з людзьмі і якім чынам дасягае пастаўленых мэт.**


Фота Надзеі БУЖАН.

***— Ці мяняецца апошнім часам характар праблем, з якімі людзі звяртаюцца на прыёмах грамадзян?***

— Падчас нядаўняга асабістага прыёму грамадзяне прасілі дапамогі і садзейнічання ў пераводзе дзіцяці ў іншую школу, уладкаванні міні-стадыёна, аднаўленні дагавораў арэнды... Людзі звярталіся і тэму газіфікацыі ў адным з пасёлкаў, работы аграпрамысловых прадпрыемстваў. Прыкладна 70 працэнтаў усіх пытанняў падчас асабістых зваротаў эфектыўна вырашаюцца, нейкая частка бярэцца на кантроль. На кантролі, напрыклад, пытанне бадзяжных жывёл. Адны іх падкормліваюць, але не жадаюць узяць да сябе, а другія выступаюць за адлоў і магчымасць спакойна хадзіць па вуліцы. Гэта тэма бясконцых канфліктаў. У нас ёсць дзве грамадскія арганізацыі, якія цесна супрацоўнічаюць з спецаўтабазай, якая адлоўлівае і стэрылізуе жывёл. Грамадскія арганізацыі дапамагаюць пасля перадаваць іх тым, хто паклапоціцца б пра братоў нашых меншых.

Летась паступіла крыху менш зваротаў, чым у 2015 годзе, — 490. Кожны трэці быў звязаны з упарадкаваннем дваровых і гарадскіх тэрыторый, рамонтам жыллёвага фонду і аплатай паслуг жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Пытанні таго ж рамонту вырашаюцца ў рабочым парадку паводле плана. Мы тлумачым, што тэхнічныя характарыстыкі важнейшыя за сам тэрмін. Можа быць і так, што 25-гадовому дому капрамонт спатрэбіцца хутчэй, чым 40-гадоваму.

Аналіз зваротаў паказвае, што на другім месцы па частаце — пытанні працаўладкавання. Да канца 2014 года ў нас не хапала рабочых рук, асабліва ў галіне камунальнай гаспадаркі. Аднак з пачатку 2015-га на тых жа будаўнічых прадпрыемствах пачалася аптымізацыя колькасці работнікаў, аб'ёмы работ зменшыліся. Сур'ёзныя цяжкасці ўзніклі і ў аднаго нашага камунальнага гандлёвага прадпрыемства, якое займаецца рэалізацыяй прадуктаў харчавання, тавараў народнага спажывання. Сёння вакансій нізкакваліфікаванай катэгорыі стала менш, а колькасць прэтэндэнтаў на іх вырасла. Тым не менш нам удалося летась нават перавыканаць план па стварэнні працоўных месцаў (пры зададзенні 440 створаных 496). Працуем найперш у галіне малога і сярэдняга бізнесу — спрашчаем, напрыклад, працэдуру здачы памяшканняў у арэнду. Актыўнасць праяўляюць і банкі, якія прапануюць крэдыты на выгадных умовах.

Аснова эканомікі горада — на 97 працэнтаў — прадпрыемствы «Белнафтахіма». 10 тысяч чалавек працуюць толькі на «Нафтане». Дзесьці кожны трэці жыхар горада заняты на прадпрыемствах, звязаных з нафтахімічнай галіной, напрыклад, спецадзенне шые «Нафтансэрвіс». Вядома, на такія прадпрыемствы набор кадраў ажыццяўляецца, галоўным чынам, на конкурснай аснове, сюды чалавека без належнай адукацыі не возьмеш. Я лічу, самі прадпрыемствы павінны шукаць спосабы, як заняць людзей, і не баяцца браць маладых спецыялістаў. Будзем спадзявацца, што наша прамысловасць — выраб металаканструкцый або радыёэлектроніка — зацікавяць інвестараў пасля таго, як у свабодную эканамічную зону «Віцебск» будзе ўключаны новы сектар агульнай плошчай 92 га — тэрыторыя Наваполацка і прамысловай зоны г. п. Баравуха.

***— Якім чынам плануеце працягваць стварэнне новых працоўных месцаў?***

— У студзені ўрачыста адкрылася новае прадпрыемства па выпуску смажанага гароху ў тым жа пасёлку Баравуха пад Наваполацкам. Гэта будзе каля 50 працоўных месцаў. У сакавіку на Біямехзаводзе бытавых другасных рэсурсаў была афіцыйна запушчана новая лінія — гэта яшчэ пяць рабочых месцаў. У сакавіку адбыўся і аўкцыён па продажы былога кінатэатра «Космас», які будзе рэканструяваны і перапрафіляваны пад аўтасэрвісны цэнтр. Таксама нядаўна мы збіралі прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу, каб растлумачыць і нагадаць аб фінансава-крэдытных магчымасцях для развіцця іх прадпрыемстваў і арганізацый, пазнаёмілі з работай Савета па развіцці прадпрымальніцтва, створанага пры Наваполацкім гарвыканкаме. Расказалі і пра паслугі Наваполацкага цэнтра прадпрымальніцтва і нерухомасці. Акрамя таго, паведамілі пра ўвядзенне мараторыя на правядзенне праверак з 1 студзеня наступнага года.

Летась у органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне звярталіся з пытаннем працаўладкавання 3767 чалавек, што складае 86 працэнтаў да ўзроўню папярэдняга года. У якасці беспрацоўных зарэгістраваны 2571 чалавек — на 17 працэнтаў менш, чым у 2015-м. На працягу года 2681 чалавеку аказалі садзейнічанне ў працаўладкаванні (з іх беспрацоўных — 1623). 26 беспрацоўных атрымалі субсідыі на арганізацыю аграэкатурызму і іншай прадпрымальніцкай дзейнасці. 798 чалавек (з іх 696 беспрацоўных) прыцягваліся да аплачваемых грамадскіх работ. У сельскую мясцовасць з дэфіцытам рабочых рук пераехалі пры бюджэтнай фінансавай падтрымцы пяць сем'яў.

***— Людзей заўсёды хвалюе развіццё сацыяльнай сферы...***

— За нашай гарадской бальніцай замацаваны дзевяць тэрытарыяльна блізкіх раёнаў. Вядома, першачарговая дапамога аказваецца на месцах, а сюды накіроўваюцца пацыенты з больш цяжкай паталогіяй. Бо менавіта на базе нашай бальніцы актыўна развіваюцца высокатэхналагічныя метады дапамогі. Летась была праведзена рэканструкцыя памяшканняў пад устаноўку ангіёграфа і камп'ютарнага тамографа. На гэты год запланавана стварэнне на базе міжраённага афтальмалагічнага аддзялення гарадской бальніцы міжраённага цэнтра мікрахірургіі вока. Будзем працягваць работу па адкрыцці траўматалагічнага пункта для жыхароў Наваполацка і Полацка, міжраённага цэнтра рэнтгенэндаваскулярнай хірургіі. У дзіцячай паліклініцы будзе працягвацца работа па стварэнні цэнтра алергалогіі.

У горадзе працуюць 12 школ, дзве гімназіі і агульнаадукацыйны ліцэй, а летась уведзены ў эксплуатацыю вучэбны комплекс «Яслі—садок—пачатковая школа», на базе якога адкрыты філіял гімназіі №1. Праектуем новыя ўстановы адукацыі ў густанаселеных раёнах новай забудовы. У СШ №8 працягваецца апрабацыя мадэлі інклюзіўнай адукацыі. А пры падтрымцы Еўрапейскага саюза стартаваў новы праект «Наваполацк — ад інклюзіўнай школы да інклюзіўнага горада», у межах якога на базе школы павінны з'явіцца ўнікальная спартыўная пляцоўка і ліфт для навучэнцаў з абмежаванымі магчымасцямі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by* ■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КНДР паказала відэа з імітацыяй ракетнага ўдару па ЗША

Ролік быў прадэманстраваны падчас святочнага канцэрта, прысвечанага 105-годдзю з дня нараджэння Кім Ір Сена — дзеда цяперашняга паўночнакарэйскага лідара Кім Чэн Ына. На кадрах бачна, як снарад стартуе, перасякае акіян і ўзрываецца ў адным з амерыканскіх гарадоў. У завяршальнай сцэне відаць магілкі і падпалены амерыканскі сцяг.

### Большасць расіян лічаць, што цела Леніна трэба пахаваць

Прапанову вынесці з маўзалея і пахаваць цела Уладзіміра Леніна падтрымліваюць 58% расіян. Пра гэта сведчаць даныя апытання, праведзенага «Лявада-Цэнтрам». 32% прапанавалі аддаць зямлі цела Леніна каля Крамлёўскай сцяны. 26% лічаць, што пахаванне павінна прайсці на Волкаўскіх могілках у Санкт-Пецярбургу. 31% апытаных заявілі, што цела савецкага палітыка трэба пакінуць у маўзалеі. 11% не вызначыліся з адказам.

### МВФ прагназуе сёлета ў Венесуэле інфляцыю ў 720%, а налета — у 2000%

Такія звесткі прыведзены ў новым прагнозна-аналітычным дакладзе Міжнароднага валютнага фонду па стане і найбліжэйшых перспектывах сусветнай эканомікі. Эксперты фонду лічаць, што Венесуэла па-ранейшаму будзе перажываць вялікія эканамічныя цяжкасці і «сутыкацца з сур'ёзнымі абмежаваннямі ў галіне імпарту тавараў». Эканоміка краіны можа скараціцца на 7,4%, а ўзровень беспрацоўя вырасце з 21,2% да 25,3%. Летась, па звестках Цэнтрабанка краіны, інфляцыя ў Венесуэле склала 800%.

### Новая Зеландыя змяняе міграцыйнае заканадаўства па прынцыпе «спачатку ківі»



Урад Новай Зеландыі абвясціў аб унясенні змяненняў у міграцыйнае заканадаўства з мэтай засцерагчы мясцовы рынак працы ад замежнай рабочай сілы. «Гэтыя змены заклікаюць заахвоціць работадаўцаў наймаць больш «ківі», укладваючы сродкі ў іх навучанне», — заявіў міністр іміграцыі, працоўных адносін і бяспекі краіны Майкл Вудхаус, выкарыстоўваючы гутарковы тэрмін, які пазначае новазеландцаў. Як вядома, летась у краіне быў зафіксаваны рэкордна высокі ўзровень міграцыі — каля 70 тыс. чалавек.

■ Бяспека

# СПРОШЧАНЫЯ ПАЛЁТЫ І ПАДРЫХТОЎКА ВАЕННЫХ КАДРАЎ

## У Мінску прайшло чарговае пасяджэнне Ваеннага камітэта АДКБ

**Выклікі і пагрозы ваеннай бяспецы ў рэгіёнах калектыўнай адказнасці АДКБ — адно з ключавых пытанняў, разгледжаных удзельнікамі пасяджэння. Сярод іх — начальнікі генеральных штабоў узброеных сіл Арменіі, Беларусі, Казахстана, Расіі, Таджыкістана, першы намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Кыргызстана, начальнік Аб'яднанага штаба АДКБ.**

— Падчас юбілейнага, дзясятага, пасяджэння Ваеннага камітэта АДКБ разгледжана пяць ключавых пытанняў, — зазначыў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ.** — Некаторыя з іх датычацца ўнутранага характару: спрашчэнне працэдур пералётаў і стварэнне пэўных органаў для хутчэйшага вырашэння пытанняў у межах гэтай арганізацыі.

Акрамя таго, згодна з рашэннем Ваеннага камітэта, у інтарэсах дзяржаў — членаў АДКБ будзе наладжана падрыхтоўка ваенных кадраў у сістэме супрацьпаветранай абароны. Навучанне будзе весціся ў Ваеннай акадэміі паветрана-касмічнай абароны імя Маршала Савецкага Саюза Г. К. Жукава, а таксама ў Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь.

Як заявіў **начальнік Аб'яднанага штаба АДКБ генерал-палкоўнік Анатоль СІДАРАЎ**, падчас пасяджэння ўзнімаліся прынцыповыя пытанні. «Мяне радуе тое, што яны знайшлі падтрымку, разуменне і будуць служыць умацаванню ваеннага складніка Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы», — падкрэсліў начальнік Аб'яднанага штаба АДКБ.



Фота БЕЛТА.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Кампетэнтна

# РЭЗЕРВЫ ЁСЦЬ

**Міністр эканомікі Беларусі Уладзімір ЗІНОЎСКІ пракаментаваў эканамічныя паказчыкі за першы квартал 2017-га.**

«Вынікі першага квартала нас пакуль задавальняюць», — адзначыў ён. Па словах міністра, добра спрацаваў «Беларуськалій» і «ўжо пайшла па дамоўленасці расійская нафта». Адпаведна, ёсць загрузка нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў. Гэта дало пэўны рост у прамысловасці. Пры гэтым недзяржаўныя прадпрыемствы згаданай сферы паказалі больш хуткі рост, няблага спрацавалі прадпрыемствы машынабудавання Мінпрама, паднялася сфера будаўніцтва.

Каментуючы сітуацыю па нафтагазавых перамовах з Расіяй, міністр эканомікі адзначыў, што перапрацоўка нафты будзе ісці нармальна. «Мы плануем закупіць нафты 24 мільёны тон, — паведаміў ён. — Безумоўна, крыху недабраўшы ў першым квартале, мы нагонім гэтыя аб'ёмы ў другім і трэцім».

Што датычыцца пытання сярэдняй заработнай платы ў 1000 рублёў, то павінны прымацца канкрэтныя меры: неабходна выпрацоўваць больш тавараў, паніжаючы іх сабекошт, і пры гэтым пастаўляць прадукцыю на экспарт. «Але кожнаму трэба быць уважлівым, пільным на сваім працоўным месцы, — падкрэсліў міністр. — Іншага выйсця ў нас няма, а рэзервы яшчэ ёсць».

Эканамічны стан «Беларуськалія» пракаментаваў яго **генеральны дырэктар, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Іван ГАЛАВАТЫ.** «Сёлета аб'ём вытворчасці складзе каля 10 мільёнаў тон, што на ўзроўні мінулага года», — паведаміў ён і даў прагноз наконт аб'ёму экспарту «Беларуськалія», якія павінен скласці 9—9,5 мільёна тон.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Беражыце сябе

# Паклічце пажарнага, каб бяды не адбылося

**Колькасць загінулых у агні штогод зніжаецца**

**З 3 па 28 красавіка па ўсёй краіне праводзіцца пажарна-прафілактычная акцыя «За бяспеку разам». Сумесна з МНС у ёй прымаюць удзел міністэрствы ўнутраных спраў, інфармацыі, адукацыі, энергетыкі, працы і сацыяльнай абароны, ЖКГ, аховы здароўя, а таксама Добраахвотнае пажарнае таварыства.**

Як паведаміў **першы намеснік начальніка ўпраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Уладзімір СУВОРАЎ**, у бягучым годзе колькасць загінулых на пажарах паменшала на 18%. Каля 80% усіх пажараў і 98% загінулых прыпадае на жыллёвы фонд. Асноўнай прычынай трагедый з'яўляецца чалавечы фактар: 77% пажараў з гібеллю людзей узнікае з-за неасцярожнага абыходжання з агнём, 10% выкліканы парушэннямі патрабаванняў пры эксплуатацыі пячнога ацяплення, да 7% — электраабсталявання.

Падчас акцыі асноўныя намаганні засяроджваюцца на праверцы домаўладанняў пажылых адзінокіх людзей, шматдзетных сем'яў, сацыяльна няўстойлівых грамадзян, асаблівая ўвага ўдзяляецца ветэранам Вялікай Айчыннай вайны.

— Кожны можа звярнуцца ў тэрытарыяльнае падраздзяленне ці раённы аддзел МНС з просьбай правесці абследаванне жылля. Падчас яго даецца рэкамендацыі, як павысіць узровень пажарнай бяспекі. І ўсё гэта на бязвыплатнай аснове. Сёлета ўжо паступіла больш за 200 заявак на абследаванне, — адзначыў Уладзімір Суvotaраў.

Акрамя таго, з 3 красавіка аказана дапамога па прывядзенні ў бяспечны стан электраправодкі ў 95 домаўладаннях, пячнога ацяплення — у 107 домаўладаннях, усталявана больш як 880 аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў. Дарэчы, дзякуючы ім толькі сёлета ўжо выратавана 53 чалавекі, у мінулым годзе — 127 чалавек, а з 2002 года, калі прыборы атрымалі шырокае распаўсюджванне, — 2088 чалавек. Уладзімір Суво раў заклікаў задумацца пра тое, што кошт апавяшчальніка не ідзе ні ў якое параўнанне з каштоўнасцю чалавечага жыцця.

Нягледзячы на пераменлівае надвор'е, у цэнтры ўвагі — недапушчальнасць выпальвання сухой расліннасці і выкананне патрабаванняў пажарнай бяспекі пры развядзенні вогнішчаў. За некалькі месяцаў гэтага года зарэгістравана ўжо 902 пажары ў прыродных экасістэмах.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

## АБЛВЫКАНКАМЫ НА ПРАМОЙ СУВЯЗІ

**Традыцыйна ў суботу 22 красавіка, з 9.00 да 12.00 гадзін ва ўсіх абласных і Мінскім гарадскім выканаўчых камітэтах пройдуць прамыя лініі. Гэтым разам на тэлефонный сувязі з насельніцтвам будуць працаваць:**

**Брэсцкі аблвыканкам:**
першы намеснік старшыні ТОКАР Мікалай Васільевіч.
Тэл. 8 016 221 31 21

**Віцебскі аблвыканкам:**
намеснік старшыні БЕЛАУС Уладзімір Мікалаевіч.
Тэл. 8 021 222 22 22

**Гомельскі аблвыканкам:**
намеснік старшыні ПРЫВАЛАЎ Уладзімір Аляксандравіч.
Тэл. 8 023 275 12 37

**Гродзенскі аблвыканкам:**
намеснік старшыні ДЗЯШКО Уладзімір Іосіфавіч.
Тэл. 8 015 273 56 44

**Магілёўскі аблвыканкам:**
першы намеснік старшыні ЧЫКІДА Алег Іванавіч.
Тэл. 8 022 250 18 69

**Мінскі аблвыканкам:**
намеснік старшыні НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч.
Тэл. 8 017 500 04 16

**Мінскі гарвыканкам:**
намеснік старшыні ЮРКЕВІЧ Ігар Віктаравіч.
Тэл. 8 017 222 44 44

■ Суботнік

# ПОМНІКАМ АРХІТЭКТУРЫ — АСАБЛІВАЯ ЎВАГА

**Гомельшчына ў рэспубліканскім суботніку плануе зарабіць больш за 1,1 млн рублёў. Для гэтага каля 445 тысяч жыхароў вобласці будуць удзельнічаць у запланаваных на 22 красавіка мерапрыемствах.**

Вялікая частка людзей будзе працаваць на сваіх месцах. У тым ліку ў сельскай гаспадарцы, дзе аграрыі цяпер актыўна занятыя на сяўбе. Да навядзення парадку на зямлі далучацца школьнікі, студэнты, пенсіянеры, а таксама прадстаўнікі органаў улады.

Жыхары рэгіёна будуць займацца добраўпарадкаваннем. У тым ліку — турыстычных славутасцяў, месцаў баявой і вайсковай славы, мемарыяльных комплексаў, пахаванняў Вялікай Айчыннай вайны, могілак. Не абыдуць увагай скверы, паркі, зоны адпачынку і вуліцы. У розных кутках абласнога цэнтра будуць закладзены новыя алеі. Камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання рыхтуюцца мабілізаваць жыхароў дамоў на добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый.

Веткаўскі раён прыме некалькі дэсантаў працаўнікоў, якія зоймуцца добраўпарадкаваннем помнікаў архітэктуры: Чырвонай плошчы райцэнтра і сядзібна-паркавага комплексу ў вёсцы Хальч.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Мілаванаву Міхаілу Вячаслававічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БРАТА.**

■ Бізнес і ўлада

# Памылкі выправяць і дэкрыміналізуюць

**У сённяшняй няпростай фінансавай сітуацыі кіраўнікі прадпрыемстваў і прадпрымальнікі часам вымушаны ісці на пэўную эканамічную рызыку. А памылкі тут каштуюць дорага — можна стаць фігурантам крымінальнай справы. Таму кіраўніцтва краіны цяпер ставіць задачу пераарыентаваць кантрольныя і наглядныя органы на папярэджанне парушэнняў, а таксама знізіць фінансавыя санкцыі за нязначныя памылкі. Менавіта для разняволення дзелавой ініцыятывы Дэпартамент фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю прапануе дэкрыміналізацыю асобных злачынстваў супраць парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці, паведаміў учора ў прэс-цэнтры БЕЛТА намеснік дырэктара ДФР Віктар ФРАНСКЕВІЧ.**

Дэпартаментам прааналізаваны пытанні магчымай аптымізацыі крымінальнай адказнасці за эканамічныя злачынствы, а прапановы накіраваны для ўключэння ў законапраект «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны кодэксы Рэспублікі Беларусь». Асноўнай прычынай прапанаванай дэкрыміналізацыі асобных эканамічных злачынстваў стала развіццё і змяненне грамадскіх адносін у гэтай сферы, а некаторыя ўчынкі страцілі сваю грамадскую небяспеку і могуць быць пераведзены ў разрад адміністрацыйных парушэнняў, калі за іх здзяйсненне вінаватыя асобы не будуць несці крымінальную адказнасць, лічаць у дэпартаменце.

Напрыклад, ДФР лічыць мэтазгодным дэкрыміналізацыю ўчынкаў, якія прадугледжаны часткай 1 артыкула 237 (вымаганне крэдыту або субсідыі) Крымінальнага кодэкса (КК). Аналіз выяўленых органамі фінансавых расследаванняў злачынстваў па гэтым артыкуле паказвае, што часцяком такія крымінальныя справы ўзбуджаюцца ў дачыненні да кіраўнікоў прадпрыемстваў па фактах атрымання крэдытаў на вытворчыя патрэбы (выплату заработнай платы, папаўненне абаротных сродкаў, закупку сыравіны і матэрыялаў і інш.). Пры гэтым у пераважнай большасці выпадкаў суб'екты гаспадарання добраахвотна і своечасова вяртаюць прадастаўленыя банкамі па падробленых дакументах крэдытныя сродкі альбо такія крэдыты не былі атрыманы ўвогуле. Таму спецыялісты дэпартамента перакананы, што крымінальная адказнасць з'яўляецца крайняй мерай барацьбы з найбольш небяспечнымі формамі парушэнняў, а ў гэтым выпадку будзе дастаткова адміністрацыйнага пакарання.

Віктар Франскевіч паведаміў, што іх структура прапануе выключыць з КК артыкул 242 (ухіленне ад пагашэння крэдытарскай запазычанасці). Рэалізацыя гэтага новаўвядзення не прывядзе да ўшчамлення эканамічных інтарэсаў прадпрыемстваў, паколькі паўплываць на асоб, якія ўхіляюцца ад пагашэння крэдытарскай запазычанасці па судовай пастанове, можна праз больш актыўнае прымяненне на практыцы артыкула 11.18 (ухіленне ад пагашэння крэдытарскай запазычанасці) Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях (КаАП). Надалей бездакорна павінны дзейнічаць ужо органы прымусовага выканання, упэўнены ў дэпартаменце.

Яшчэ ў ДФР лічаць магчымым дэкрыміналізаваць дзеянні, якія прадугледжаны артыкулам 224 (парушэнне парадку адкрыцця рахункаў за межамі Беларусі) і артыкулам 261 заўв. 1 (выраб, збыт або выкарыстанне падробленых акцызных марак Беларусі). Акрамя таго, у дэпартаменце прапануюць адмовіцца ад крымінальнай адказнасці па злачынствах, прадугледжаных артыкулам 233 (незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць). Тут дэкрыміналізуецца забароненая прадпрымальніцкая дзейнасць, прадпрымальніцкая дзейнасць без ліцэнзіі і прадпрымальніцкая дзейнасць без рэгістрацыі.

Віктар Франскевіч адзначыў, што цяпер у агульнай колькасці крымінальных злачынстваў на долю эканамічных прыходзіцца не больш за 7%. Пасля дэкрыміналізацыі асобных эканамічных злачынстваў, калі прапановы ДФР будуць падтрыманы і знойдуць адлюстраванне ў заканадаўстве, удзельная вага іх стане яшчэ меншай.

**Начальнік аддзела прававога забеспячэння, інфармацыі і работы са зваротамі грамадзян Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Мікалай ІВАНЬКОЎ** адзначыў, што рэалізацыя прапаноў ДФР (у выпадку іх адабрэння) залежыць ад тэмпаў праходжання праекта нарматыўнага прававога акта. Не выключана, што адпаведны законапраект будзе разгледжаны на вясеннай сесіі парламента. А рэальна запрацаваць гэтыя новаўвядзенні могуць ужо летам наступнага года, паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзела.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Занятасць

# ПАТРАБУЮЦЦА ПРАЦАВІТЫЯ, АДКАЗНЫЯ І КВАЛІФІКАВАНЫЯ

## Якіх спецыялістаў шукалі на сталічным кірмашы вакансій?


Фота Надзеі БУЖАН.

**Учора мінчане выстройваліся ў чаргу па работу. У прамым сэнсе — у Палацы культуры чыгуначнікаў, дзе праходзіў гарадскі кірмаш вакансій, было не павярнуцца. Магчымасці працаўладкавання прапаноўвалі больш за 90 прадпрыемстваў. Дзе патрэбны рабочыя рукі, даведалася і «Звязда».**

### Прадаўцы нарасхват

Традыцыйна вакансіі ёсць у сферы гандлю. Сетка крамаў у Фрунзенскім раёне набірае кухараў (заробак — 300—350 рублёў) і эканамістаў (прапануюць 400 рублёў).

— Я маркетолагам, менеджарам працавала. Агульны стаж — каля чатырох гадоў. Эканамістам возьмеце? — цікавіцца маладая жанчына.

— А вы цэнаўтварэнне ведаеце? Са справаздачамі па затратах, прыбытках працавалі? Не? Тады не падыходзіце, — катэгарычныя ў кадравым аддзеле.

Іншая гандлёвая сетка прымае кандыдатаў у кадравы рэзерв. «Пакуль свабодных месцаў няма. Але кампанія вялікая, вакансіі перыядычна вызваляюцца, — тлумачыць прадстаўніца арганізацыі. — У нас добрыя заробкі. Прадавец атрымлівае ад 620 рублёў «чыстымі», у залежнасці ад разраду».

А вось яшчэ адзін буйны ігрок сеткавага гандлю гатовы браць прадаўцоў і касіраў ужо зараз. Можна без вопыту. «Заработная плата залежыць ад таго, у якой краме працуеш. Чым большая гандлёвая плошча, тым вышэйшы заробак. Касір атрымлівае ў асноўным 500 рублёў. Гэта без прэміі», — запэўніваюць у арганізацыі.

Ледзь не самая вялікая чарга саіскальнікаў сабралася каля стэнда кампаніі, якая гандлюе будматэрыяламі. Там у новы гандлёва-лагістычны комплекс са складам, што ў пасёлку Прывольны (15 кіламетраў ад сталіцы, дастаўка службовым транспартам ад метро), запрашаюць кладаўшчыкоў, грузчыкаў, рабочых па комплексным абслугоўванні будынка. Усяго каля 20 вакансій з заробкамі ў 500—550 рублёў.

### Галоўнае для вартаўніка — здароўе

Сярод наведвальнікаў кірмашу шмат выпускнікоў.

— Маладыя спецыялісты вам не патрабуюцца? — цікавіцца ў «Мінскводаканала» юнак.

Аляксей разам з аднагрупніцай заканчвае БНТУ, спецыяльнасць — «гідратэхнічныя збудаванні». Кажа, што на факультэт прыйшло мала заявак ад прадпрыемстваў. Ёсць, ведома, прапановы з Любані, Віцебска, але ж хочацца затрымацца ў сталіцы...

Афіцыянтаў, кухонных рабочых, агентаў па забеспячэнні шукае пяцізоркавы гатэль, краўцоў — сетка майстэрняў па рамонце абутку, кіроўцаў катэгорыі «D» ці «D, E» — аўтобусны парк. Некваліфікаваную працу гатовы прапанаваць Ленінскі аддзел Дэпартамента аховы МУС: ёсць вакансіі вартаўнікоў, ахоўнікаў, кантралёраў на КПП. Месца работы — паліклінікі, адміністрацыя. Галоўнае — добры стан здароўя і ўзрост да 60 гадоў.

Стаць міліцыянерам ці кінолагам запрашае Мінскае абласное ўпраўленне Дэпартамента аховы МУС. З пажаданняў да кандыдата — сярэдняя спецыяльная ці вышэйшая адукацыя (неабавязкова профільная, педагагічная і тэхнічная таксама падыдуць), служба ў арміі. Прымаюцца хлопцы да 27 гадоў. «Дзяўчат ужо набралі», — смяюцца ва ўпраўленні.

Шмат саіскальнікаў цікавіліся вакансіямі ў прамысловасці. Праўда, заняць гэтыя месцы не проста. На Мінскім заводзе колавых цягачоў, дзе неабходны фрэзероўшчыкі, шліфоўшчыкі, токары, травільшчыкі (усюды — 5-ы разрад), адзначаюць, што кандыдаты рэдка адпавядаюць умовам. «У нас вельмі вузкая накіраванасць. Патрэбны спецыяльныя веды».

У холдынгу «АМКАДОР» чакаюць працалюбівых і дысцыплінаваных. Умовы добрыя: сярэдні заробак у кампаніі — 900 рублёў, а цякучка кадраў за мінулы год склала ўсяго пяць працэнтаў. Інжынеры-канструктары і інжынеры-тэхнолагі могуць уладкавацца на «Будмаш». Патрабаванне — 1—2-і разрад, заработная плата — 600 рублёў.

### Чарга ў санітаркі

Каля стэндаў арганізацый аховы здароўя нешматлюдна. Яно і зразумела: у медыкі без адукацыі не пойдзеш. Цікавімся, што ва ўрачоў з заробкамі. У 34-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклініцы Савецкага раёна тэрапеўтам-участковым, акушэрам-гінеколам, неўролагам гатовы плаціць 500—600 рублёў. Рэнтгеналабарантам абяцаюць каля 400 рублёў, медсёстрам — 500.

Сярод тых, хто запісаўся падчас кірмашу на работу ва ўстановы аховы здароўя Кастрычніцкага раёна, у асноўным санітаркі і санітаркі-буфетчыцы. На заробак у 300 рублёў згодныя ісці пенсіянеркі.

— Я дома пасядзела паўгода, больш не магу! — дзеліцца адна з пажылых жанчын. — Раней у гандлі працавала. А цяпер хоць куды гатова ісці — санітаркай, на дзяжурствы. Сумна без справы.

Упраўленне адукацыі, спорту і турызму адміністрацыі Кастрычніцкага раёна шукае ў асноўным выхавацеляў у дзіцячыя садкі. «Заробак — 300—400 рублёў. Гэта калі толькі пасля ўніверсітэта чалавек прыходзіць. А калі спецыяліст са стажам, катэгорыяй, то будзе атрымліваць рублёў 500». Некалькі вакансій рабочых, якія таксама прапаноўвала ўпраўленне, разабралі ўжо праз гадзіну адкрыцця кірмашу. Запісваліся і кандыдаты ў вартаўнікі — праўда, месцаў для іх няма.

### На беспрацоўнага — 1,5 вакансіі

Цяпер у сталіцы налічваецца каля дзевяці тысяч вакансій. Амаль палова (46%) — для рабочых. Па інфармацыі камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, асноўны попыт фарміруюць арганізацыі будаўніцтва (23%), аховы здароўя і прадастаўлення сацыяльных паслуг (20%), гандлю (9,6%), прамысловасці (9%), адукацыі (7,5%).

У сярэднім на аднаго беспрацоўнага прыпадае 1,5 вакансіі (год таму — 0,8). Але па-ранейшаму захоўваецца дысбаланс попыту і прапановы. Наймальнікам больш за ўсё неабходны рабочыя прафесіі: прадаўцы, кухары, муляры, мантажнікі, арматуршчыкі, цесляры-бетоншчыкі, швачкі. Са спецыялістаў самыя запатрабаваныя — медсёстры, урачы, фельчары, выхавацелі, праграмісты. А вось сярод саіскальнікаў канкурэнцыя назіраецца на вакансіі прыбіральшчыкаў, грузчыкаў, падсобных рабочых, вартаўнікоў і дворнікаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# НЕ АДЫХОДЗЯЧЫ АД КАСЫ...



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Непадалёк прымасцілася знаёмая шматлікім мясцовым жыхарам бабуля, якая ў любую пару года прапануе адзін і той жа тавар — набор пакетаў. Цяжка ўявіць сітуацыю, калі камусьці ў пераходзе метро ён можа тэрмінова спатрэбіцца, хутчэй, купляюць іх у яе з-за расчуленасці, якую выклікае яе незвычайна безабаронны і кранальны знешні выгляд. Я, вядома ж, раблю тую зусім непатрэбную мне пакупку і спрабую разгаварыць сціплую прадаўшчыцу. «Вам не цяжка так працаваць?» — «Не, усё добра, дзетачка». На ўсе далейшыя распыты пажылая жанчына выдае толькі гэту фразу. І самае дзіўнае, што ў яе словах чуецца ўпэўненасць. Хіба, а як інакш вытрымліваць гэта штодзённае «дзяжурства»?

### «Купіце кветкі каханай!»

На лесвіцы размясціўся філіял кветкавага рынку. Калі яшчэ год таму тут прадавалі толькі ўласнаручна сабраныя і складзеныя ў стракатыя букеты лясныя або садовыя кветкі, то цяпер бессаромна гандлююць «шыкоўнымі» ў параўнанні з імі парніковымі ружамі. На гэтым участку «паляванне» аб'яўляюць на адзінокіх маладых хлопцаў ці тых, хто ўжо знаходзіцца ў пары, што нярэдка, калі яны робяць выгляд, нібыта не чуюць заклікаў «купіць каханай кветкі», прымушае іх густа чырванець.

«Вясна. Напэўна, шмат закаханых?» — прыглядаючыся да рознакаляровых букецікаў, пытаюся я ў бойкай жанчыны з яркай, пад колер кветак, памадай. «А то. Ёсць тыя, у каго вочы проста свецяцца, яны самі падбягаюць. А іншых і падштурхнуць, паклікаць трэба». — «Няўжо вам тут зручна стаяць?» — «Ды з кветкамі толькі тут і можна! Цяпер не тыя часы, каб мужчыны без нагоды адпраўляліся ў салон. А так яны з работы дадому едуць, думаюць, эх, мяне там супчык гарачы чакае... А тут мы, з кветкамі, і ў іх адразу думка: трэба ж і жонку парадаваць. І самае галоўнае — гэта нядорага. Я ж добрую справу раблю!» Трохі паразважаўшы аб сучасным тыпе рамантычных учынкаў, нарэшце выходжу «на свет»... Здаецца, асартымент нават самых вялікіх супермаркетаў «адпачывае» ў параўнанні з імправізаваным рынкам. Арганічная, як цяпер модна казаць, прадукцыя з уласных агародаў — пакуль толькі зелянiна і зрэдку радыска, астатняе — у закатках, «заморскія» прысмакі, напрыклад, паспелыя ўжо да пачатку красавіка гіганцкія трускалкі, быццам бы, наўпрост з Грэцыі, нямецкі шакалад, нераспрададзеныя да Вялікадня шакаладныя яйкі, цяпер — нібы на зніжках, танная сінтэтычная вопратка, а побач — цёплыя вязаныя шкарпэткі і нават дзіцячыя кніжкі. Перад Радаўніцай «у топе» штучныя кветкі.

### «Гэта, як гаворыцца, не для прэсы»

Для няўзброенага вока можа быць непрыкметна, але прастора арганізавана па складанай лагістычнай сістэме. Прадаўцы з найбольшай разнастайнасцю тавараў, асабліва ядомых, якія не пакідаеш у сумкі за пару секундаў, размяшчаюцца ў аддаленні ад выхаду з метро. Гандляры штучнымі кветкамі хаваюцца за прыпынкам, а самыя «смелыя» з іх — нават займаюць запаветную лавачку. Каля выхаду з падземкі гуртуюцца бабулі. У перыяд найбольшай небяспекі — калі праверыць «рынак» прыходзяць супрацоўнікі міліцыі — уся гэтая разрозненая група людзей дзейнічае як адзіны арганізм.



Дастаткова аднаго слова «ідзе», каб прадаўцы, хутчэй, чым пажарныя апранаюць свой касцюм, сабралі тавары і паспрабавалі растварыцца ў натоўпе. Частка хаваецца ў свае машыны, прыпаркаваныя непадалёк, частка «перетвараецца» ў пасажыраў з вялікімі сумкамі, якія з нецярпеннем чакаюць свайго транспарту, а частка проста адыходзіць на некалькі сотняў метраў. Бабулі ў гэтым выпадку выконваюць функцыю «загараджальнага кардона»: нягледзячы на тое, што ўвесь падобны гандаль з'яўляецца незаконным, да іх з-за ўзросту менш за ўсё прэтэнзій.

Дарэчы, інфармацыя пра тое, што на стыхійных рынках зарабляюць сабе капейчыну выключна пажылыя людзі, далёкая ад рэчаіснасці. Шмат тут і «закаранелых» прадаўцоў, якія вылучаюцца асаблівымі звычкамі, для многіх з іх — гэта галоўная і, здаецца, нядрэнная крыніца заробку.

— Ды мне калі б нават золатам абабіты прылавак за бясплатна прапанавалі, але ў іншым месцы, я нікуды б не сышоў. Тут за тры гадзіны, калі людзі з работы вяртаюцца, я магу зарабіць ледзь не столькі ж, колькі на ўсякіх мясцовых рынках за тыдзень. Гэта, як гаворыцца, не для прэсы, але як гандлюю я зараз, так і буду працягваць, пакуль гэта будзе выгадна, колькі б мяне ні ганялі. Жыць неяк жа трэба», — нервуецца невераготна худы мужчына з ужо загарэлым на сонцы тварам. Ён зрабіў стаўку на самы ходавы тавар — агуркі, памідоры, перац.

### «Зарабляю ўнукам на пернікі»

Зразумець, што прымушае стаяць тут працаздольных людзей, якія купляюць прадукты на буйных рынках або оптам прывозяць з суседніх краін, лёгка: навошта плаціць падаткі, калі я і так «дастаткова хітры»? Але ж пенсіянеры могуць бясплатна гандляваць на рынках сталіцы. З такім пытаннем і звяртаюся да адной з найбольш мілых бабуль, якая зарабляе выключна зелянінай.

— Тут шмат маіх сяброўак, у нас дачы ў адным раёне. Гэта табе не цэнтр, значна бліжэй з дачы ехаць. А на Камароўцы, калі за месца плаціць не трэба, то за экспертызу кожны дзень — выкладай кругленькую суму. Мне тоны трэба прадаваць, каб столькі зарабіць. А я ж паціху — унукам на пернікі, ды з дзяўчатамі пагаварыць люблю.

Нягледзячы на ўсю «зручнасць» падобных гандлёвых утварэнняў, для гарадскіх уладаў — гэта па-сапраўднаму балючае пытанне. Даволі буйны «рынак» каля станцыі метро «Каменная Горка» планавалі перанесці ўглыб спальных раёнаў, аднак ні адна з разгледжаных пляцовак не падышла па тэхнічным рэгламенце, ды і прадаўцоў такое выйсце не задавальняла. Многія нават на пару метраў ад дарогі адысці не хочуць — «пакупніка трэба браць гарачанькім». З абсталяваннем гандлёвых радоў тут жа, каля метро, таксама ўзнікаюць пытанні. Адміністрацыя Фрунзенскага раёна выхад з сітуацыі пакуль не знайшла, але над рашэннем праблемы працуе.

А тым часам пакуль я спрабую завязаць размову з рознымі тыпамі прадаўцоў, жыхары навакольных мікрараёнаў, перыядычна гучна абмяркоўваючы нязручнасць расстаўленых на дарозе скрынь, маўляў, «не прайсці», працягваюць карыстацца паслугамі гэтага «сэрвісу». Попыт нараджае прапанову. Ці наадварот? Зрэшты, якая розніца?

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*


Фота Надзеі БУЖАН.

■ Запрашальнік

# Экскурсаводы клічуць

## У найбліжэйшыя дні можна бясплатна азнаёміцца з цікавінкамі родных мясцін

**У гэтыя выхадныя пройдзе ўжо традыцыйны, 8-ы Фэст экскурсаводаў, дзе кожны ахвотны можа абсалютна бясплатна наведаць экскурсію па сваім родным горадзе ці нават мястэчку, вёсцы. Але работа Фэсту пачынаецца значна раней — ужо сёння некаторыя цікавыя вандроўкі чакаюць жыхароў сталіцы.**



Поўны спіс экскурсій — месцы правядзення і час пачатку — можна адшукаць на сайце www.fest-guides.by. Там жа будзе праходзіць абавязковая электронная рэгістрацыя на выбраную экскурсію. Дарэчы, для тых, хто не мае ўласнага камп'ютара ці не надта добра валодае ім, створана тэлефонная лінія: (8017) 395 83 79 і (8044) 724 20 50. Патэлефанаваўшы на адзін з гэтых нумароў у сераду, чацвер ці пятніцу з 10 да 16 гадзін, можна запісацца на экскурсію.

— Не толькі выхадныя будуць напоўнены цікавай экскурсійнай праграмай. Фэст выходзіць за межы двух дзён, — адзначае **каардынатар Фэсту экскурсаводаў Валянціна КАРОТКІНА**. — Гэта дазволіць і ў іншыя дні, у тым ліку тым, хто ў выхадныя пакіне родны горад, патрапіць на экскурсіі і даведацца нешта цікавае. Сёлета мы вызначылі ключавыя кірункі работы Фэсту. Па-першае, гэта павінна быць аўтарская экскурсія — распрацаваная, можа быць, не для гэтага мерапрыемства, але з нейкай адметнай ідэяй, думкай (дарэчы, у Фэсце ўдзельнічаюць не толькі экскурсаводы — на ім можна пачуць і гісторыкаў, археолагаў, музейшчыкаў). Па-другое, экскурсанты змогуць скласці свой маршрут. Бо хочацца, каб людзі болей цікавіліся сваёй малой радзімай. Мэта Фэсту — зацікавіць мінакоў тымі мясцінамі, якімі яны ходзяць штодня. Мы апублікуем поўны спіс усіх экскурсій. Па Мінску іх будзе болей за 80.

Сёлета да свята ўпершыню далучацца дзеці — школьнікі правядуць уласную праграму па праспекце Незалежнасці ў сталіцы. Будуць праводзіцца і экскурсіі на замежных мовах, напрыклад на англійскай. Заяўлена экскурсія і для людзей у вазках — яны таксама змогуць палюбавацца праспектам Незалежнасці і даведацца шмат цікавінак пра яго.

**Ідэйны стваральнік Фэсту экскурсаводаў, арганізатар, які сёлета курыруе экскурсіі ў рэгіёнах, Павел КАРАЛЁЎ** расказаў:

— Ёсць «голад» на гэты фестываль. Памятаю першую экскурсію, калі мы толькі прыдумалі яго ў 2009 годзе, не ведалі, колькі прыйдзе чалавек ці прыйдзе ўвогуле? Аднак на месцы нас чакала ўжо 70 чалавек! Для першага разу правядзення гэта было надзвычай натхняльна. З тых часоў цікавасць да Фэсту не страчваецца. Беларусы надзвычай хочуць бачыць свае помнікі. Мы, на жаль, мала ведаем мінулае, і гэта трэба выпраўляць. Тое, што беларусы ў гэтым зацікаўлены, надзвычай радуе. У рэгіёнах сёлета пройдзе 70 экскурсій. Мы нікога асабліва не заахвочваем: але людзі рэгіструюцца самі, каб штосьці правесці. У гэтым сэнсе абсалютны рэкардсмен — Віцебск — там пройдзе ажно 18 экскурсій па музеях, артгалерэях, іншых месцах. У абласных гарадах — па 3—6 экскурсій. Таксама экскурсіі пройдуць у Оршы, Маладзечне, Пінску, Полацку, Лідзе, Дзяржынску і іншых. Для нас важна, каб не толькі гарады змаглі паказаць сваё майстэрства, але і мястэчкі і вёсачкі — у некаторых з іх таксама пройдуць эксклюзіўныя экскурсіі.

Сярод невялікіх населеных пунктаў, жыхары якіх вырашылі далучыцца да Фэсту, варта адзначыць вёску Юравічы Калінкавіцкага раёна — там ёсць унікальны храмавы комплекс. Вёска Мількаўшчына на Гродзеншчыне з'яўляецца месцам нараджэння Элізы Ажэшкі. З вёскі Старыя Васілішкі на Гродзеншчыне паходзіць Чэслаў Немен. Такім чынам, экскурсійная палітра надзвычай багатая.

Як адзначыла **начальнік аддзела Нацыянальнага агенцтва па турызме Ірына ВАРАНОВІЧ**, 11 мая пройдзе майстар-клас для экскурсаводаў і круглы стол на адпаведную тэму. А 12 мая будзе зладжана адмысловая экскурсія, таксама менавіта для экскурсаводаў, дзе яны пачуюць шмат карыснага для сябе. Усе зацікаўленыя могуць знайсці кантакты для запісу на сайце гэтай установы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

# КІНО ЗА... 30 КАПЕЕК

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Кінасеансы ў «Коласе» штодня арганізуюць два-тры разы. Кошт білетаў на паказ 3D ад 3,5 да 4 рублёў. Для дзятвы — 2,5 рубля. За прагляд фільма без 3D — на 50 капеек танней.

Прыемна здзіўляюць расцэнкі за дэманстрацыю фільмаў з выездам на месца. У сельскіх школах — 30 капеек.

— Наш «УАЗ» прыязджае ў школы, клубы аграрных гарадкоў і маленькіх вёсачак. Экран і ўсё неабходнае абсталяванне прывозяць. У аграгарадках «круцім кіно» да двух разоў штомесяц згодна з адпаведным стандартам, — тлумачыць Ірына Васілеўна.

Ці прыбытковае «кіно на колах»? На паказе фільма «Сляды на вадзе», прысвечанага юбілею беларускай міліцыі, зарабілі 100 рублёў. Для параўнання, у кінатэатры ў райцэнтры — 400. Калі перасоўнае кіно апрыёры стратнае, у «Коласе» — прыбытковае. У цэлым пракатчыкі працуюць, як кажуць, «па нулях». Маглі б, вядома, і з прыбыткам. Але паказ кіно — сацыяльная паслуга. Таму цэны павышаюцца вельмі рэдка.

Па зборах ад продажу білетаў талачынскія «кіношнікі» — найлепшыя ў вобласці сярод тых, хто працуе ў правінцыі.

Што падабаецца глядзець людзям у глыбінцы? Аказваецца, тое, што і ў буйных гарадах. Любяць камедыі і фантастыку. А сур'ёзнае кіно глядзець не хочуць.

Дарэчы, у фае «Коласа» ёсць зала для заключэння шлюбаў. Такім чынам, сотні жыхароў раёна ўжо распісаліся ў гэтым месцы.

Тутэйшыя, зразумела, рады, што ў іх ёсць добры кінатэатр. Насельніцтва ў райцэнтры каля 9,5 тысячы чалавек. «Колас» для іх і вяскоўцаў стаў сучасным «ачагом» культуры. Тут праводзяцца і фестывалі, агляды, конкурсы. У кінатэатры ўсё не горш, чым у буйных гарадах і нават у сталіцы краіны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

*Талачын — Віцебск.*

**извещает, что 12 мая 2017 года в 10.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Белбакалея» по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 15, актовый зал.**

Регистрация участников собрания с 8.30. При себе иметь документ, удостоверяющий личность.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 02.05.2017 года.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об избрании новых членов наблюдательного совета: Шемет Екатерины Юрьевны – главного бухгалтера, Козел Светланы Сергеевны – и. о. начальника отдела по юридической и договорной работе.
2. О досрочном прекращении полномочий члена ревизионной комиссии Лысковой Ирины Евгеньевны – начальника отдела экономики.
3. О назначении нового члена ревизионной комиссии Азарко Ольги Владимировны – заместителя главного бухгалтера.

УНП 100025653 Наблюдательный совет ОАО «Белбакалея»

белагропромбанк
традиции будущего

ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что с 22.05.2017 для договоров срочного банковского вклада (депозита) «25 лет вместе» в российских рублях, заключенных с 01.06.2016 по 14.12.2016, размер процентной ставки будет составлять 9,0% годовых.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 13.01.2017 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551

КАНТАКТ
№4 (44)
Спецпраект газеты «Звязда» сумесна з РУП «Белпошта» і РУП «Белсаюздрук»



■ Тэхналогіі

# АПЛАЦІЦЬ ШТРАФ І АТРЫМАЦЬ ДАВЕДКУ

## ў перспектыве можна будзе на пошце

**Новыя сэрвісы Белпошта прэзентавала на XXIV Міжнародным спецыялізаваным форуме па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях «ТІБО-2017», які праходзіць у сталіцы з 18 па 21 красавіка.**



Фота Надзеі БУЖАН.

— Прадпрыемства працягвае работу па некалькіх кірунках. Першы — павышэнне якасці аказання традыцыйных паслуг. Рухаемся да кліентацэнтрызму: робім усё максімальна зручным для канчатковага спажыўца, каб ад яго патрабаваўся мінімум энергазатрат. Другі кірунак — развіццё нетрадыцыйных паштовых паслуг: фінансавых, анлайн, самаабслугоўвання, супрацоўніцтва з інтэрнэт-крамамі, — расказвае **начальнік аддзела сеткавага ўзаемадзеяння Белпошты Аляксей ЦВІРКА.**

Так, карпаратыўным кліентам для адпраўкі карэспандэнцыі прапануюць выкарыстоўваць электронную марку. Выглядае яна як QR-код (ён раздрукоўваецца на ўсіх канвертах, не трэба нічога наклейваць уручную), але сьчытваецца поштай як звычайная марка. Зручна для арганізацый, у якіх шмат бізнес-перапіскі.

Распрацоўваецца сістэма грашовых пераводаў з банкаўскай карткі ў наяўныя. З яе дапамогай, напрыклад, унук праз інтэрнэт зможа перасылаць грошы бабулі ў вёску. Паколькі ў сельскай мясцовасці банкі не ўсюды ёсць, праект будзе актуальным. Сістэму запусцяць да канца гэтага года.

Плануецца таксама, што ў перспектыве на пошце можна будзе скарыстацца ўсім спектрам дзяржаўных паслуг — аплаціць штраф, атрымаць даведкі, дакументы. «Шырокая сетка аддзяленняў ахоплівае ўсе куткі краіны. Таму мы хочам зрабіць пошту такім «акном», якое дае доступ да розных паслуг», — тлумачыць Аляксей Цвірко.

Шырокая сетка дазваляе прадпрыемству актыўна супрацоўнічаць з інтэрнэт-крамамі. Белпошта бярэ на сябе дастаўку тавараў да атрымальніка, апавяшчэнне праз SMS — выступае, па сутнасці, пасярэднікам паміж прадаўцом і кліентам. Прадпрыемства развівае і ўласную інтэрнэт-краму shop.belpost.by, дзе прадстаўлены выключна айчынныя тавары. На гандлёвай пляцоўцы сабрана каля шасці тысяч найменняў тавараў ад больш чым 200 беларускіх вытворцаў. Штомесяц выдаецца каталог з акцыйнымі прапановамі. Адметна, што ў красавіку паштовая інтэрнэт-крама выйшла на расійскі рынак. У Маскву тавары дастаўляюцца на працягу 3—4 дзён, па тэрыторыі Расіі — да 10 дзён.



Падчас форуму «ТІБО» была таксама арганізавана IX Нацыянальная філатэлістычная выстаўка «Белфіла-2017», прысвечаная 25-годдзю першай беларускай паштовай маркі і 950-годдзю Мінска. Для ўдзелу ў выстаўцы было прыслана 115 калекцый з розных краін: Азербайджана, Арменіі, Германіі, Казахстана, Малдовы, Украіны і іншых.

**Начальнік выдавецкага цэнтра «Марка» прадпрыемства «Белпошта» Ірына ШЫПІЛАВА** адзначае, што сёлета актыўна заяўлена дзіцячая філатэлія — 21 калекцыя. Ёсць такія, якія складаюцца толькі з картмаксімумаў.

— Унікальнасць нашай выстаўкі пацвярджае секцыя «Ганаровы клас», — дадае Ірына Шыпілава. — Напрыклад, калекцыя «Старыя пісьмы Беларусі» Льва Коласава расказвае аб рабоце пошты на тэрыторыі Беларусі з XVII да пачатку XX стагоддзя. Можна даведацца, прынамсі, як з'явіліся штэмпелі. Ёсць яшчэ дакументы, дзе зафіксавана, што сарціроўка карэспандэнцыі ў той час праходзіла пяць разоў на дзень. А сама пошта выконвала і незвычайныя для ўстановы функцыі, нават банкаўскія.

Для наведнікаў стэнда Белпошты супрацоўнікі прадпрыемства арганізавалі розныя мерапрыемствы: розыгрыш прызоў інтэрнэт-крамы беларускіх тавараў, пазнавальную віктарыну. А ў рамках акцыі, прысвечанай Году навукі і 950-годдзю Мінска, можна было напісаць цёплыя словы ў адрас сваіх блізкіх на стыльных паштоўках і бясплатна адправіць іх у любы куток краіны ■

■ Вучымся пісаць лісты

# СА ШКОЛЬНІКА — У САВЕТНІКІ ГЕНСЕКА

## Падведзены вынікі маладзёжнага эпісталярнага конкурсу

**«Уяві, што ты саветнік новага Генеральнага сакратара ААН. Якую глабальную праблему ты дапамог бы яму рашыць у першую чаргу? Якую б параду даў, каб ён справіўся з рашэннем?» На такую тэму разважалі ўдзельнікі XXI Беларускага маладзёжнага конкурсу сачыненняў эпісталярнага жанру. Нягледзячы на свой юны ўзрост, школьнікі ўздымалі пытанні зусім не дзіцячыя.**

Конкурс праводзіцца ў рамках аднайменнага міжнароднага конкурсу, арганізаванага Сусветным паштовым саюзам, з 1971 года. Удзельнікі — падлеткі ва ўзросце да 15 гадоў.

— Творчае спаборніцтва дапамагае асэнсаваць тую важную ролю, якую іграе паштовая сувязь у нашым грамадстве, а таксама развівае жаданне пісаць лісты сябрам, родным і блізкім. Моладзь пабуджаюць задумацца над простымі, але важнымі рэчамі і выкласці свае думкі і пачуцці на паперы, — кажа **першы намеснік генеральнага дырэктара Белпошты Алена СКРЫПЧЫК,** якая ўзначаліла камісію па падвядзенні вынікаў конкурсу.

У фінальны этап выйшлі сем найлепшых сачыненняў — па адным з кожнай вобласці і Мінска. Кожнае ёсць за што пахваліць, але журы — на тое яно і журы — адзначыла і недахопы сёлетніх работ.

— Мы звярнулі ўвагу, што ёсць сачыненні, дзе школьнікі выказваюць свае думкі не па-дзіцячы, — кажа **галоўны спецыяліст упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына БУЛАЎКІНА.** — Зразумела, што педагогі павінны дапамагаць сваім вучням пры напісанні работ. Але галоўнае, каб працэнт удзелу настаўніка не перавысіў працэнт удзелу дзіцяці. Вельмі важна, каб у тэксце захавалася дзіцячая непасрэднасць.



**Пераможца сёлетняга эпісталярнага конкурсу Ірына МАКСІМУК-СУПРУНОВІЧ.**

А цяпер аб прыемным. Пераможцам сёлетняга эпісталярнага конкурсу стала вучаніца 7 «Б» кадэцкага класа брэсцкай СШ №31 Ірына Максімук-Супруновіч. Дзяўчынка ўдзельнічае ў ім ужо не першы раз. Два гады таму яе сачыненне стала найлепшым у вобласці, летась — заняла трэцяе месца на рэспубліканскім этапе. І вось нарэшце — доўгачаканая перамога.

Са школьных прадметаў Іра любіць рускую мову, літаратуру і хімію. У вольны час шые мяккія цацкі і адзенне, чытае кнігі і піша вершы. Калі пытаемся, у чым сакрэт добрага сачынення, адказвае, што галоўнае — натхненне. Так, тэму конкурснай работы — дзяўчынку хвалюе праблема міру — ёй падказалі тэлеперадачы.

Работа Ірыны Максімук-Супруновіч будзе перакладзена і накіравана ў Міжнароднае бюро Сусветнага паштовага саюза (Берн, Швейцарыя) для ўдзелу ў 46-м Міжнародным маладзёжным конкурсе сачыненняў эпісталярнага жанру. Трэба сказаць, што беларускія вучні не раз станавіліся прызёрамі сусветнага этапу (у якім, між іншым, удзельнічаюць падлеткі прыкладна са 140 краін). Напрыклад, у 2003 годзе наш канкурсант заняў першае месца, у 2008-м і 2010-м — другое, у 2009-м — трэцяе ■

■ Эканомім час

# ПАДПІСКА — ПРАЗ ТЭРМІНАЛ

## Як хутка аплаціць паслугі і не стаяць у чарзе?

**Адной з прыярытэтных задач у дзейнасці Белпошты сёння з'яўляецца павышэнне якасці абслугоўвання. Менавіта таму прадпрыемства развівае сетку ўстройстваў самаабслугоўвання.**

Пачынаючы з 2007 года, устанаўліваюцца плацежна-даведачныя тэрміналы. З іх дапамогай карыстальнікам прапануюць самастойна рабіць розныя плацяжы — за «камуналку», паслугі аператараў мабільнай і стацыянарнай сувязі, інтэрнэт. Акрамя таго, можна аформіць падпіску на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, сачыць па трэк-нумары за шляхам праходжання паштовых адпраўленняў. На сёння па ўсёй краіне ўстаноўлена больш за 900 такіх тэрміналаў. Аплата паслуг робіцца наяўнымі грашыма ці з дапамогай картак, выпушчаных рознымі банкамі, камісія не спаганяецца. Для аператыўнага абслугоўвання кліентам прапануюць таксама карыстацца адзіным нумарам плацельшчыка АРІП. Каб сэканоміць іх час, Белпошта распрацавала картку-падказку з адзіным нумарам, якую можна атрымаць у аб'ектах паштовай сувязі.

У сталічных аддзяленнях ёсць 41 устройства самаабслугоўвання SmartPOST. Яно прызначана для самастойнай адпраўкі заказной пісьмовай карэспандэнцыі вагой да двух кілаграмаў па тэрыторыі Беларусі. Карыстацца тэрміналам SmartPOST проста. Неабходна пакласці ліст на вагі (тэрмінал аснашчаны імі) і выбраць рэжым «Паштовыя паслугі»/ «Прыём заказнога пісьма». Потым пазначыць тып адпраўніка, увесці імя і прозвішча, адрас адпраўніка і атрымальніка і аплаціць паслугу. Надрукуецца квітанцыя і адрасны ярлык з прысвоеным штрых-кодам — яго трэба наклеіць на пярэдні бок канверта. Застанецца толькі апусціць ліст у спецыяльны праём пад вагамі.



Укараненне тэхналагічных навінак павышае эфектыўнасць працы аддзяленняў паштовай сувязі. Напрыклад, плацежна-даведачныя тэрміналы дазваляюць знізіць нагрузку на аперацыйныя вокны. Каб насельніцтва навучылася карыстацца новымі ўстройствамі, у аддзяленнях рэгулярна праводзяцца акцыі «Бліжэй да кліента».

А праз сайт www.belpost.by можна, не выходзячы з офіса ці дома, аформіць падпіску на газеты і часопісы, аплаціць перасылку пісьмовай карэспандэнцыі з дапамогай электроннай маркі, набыць паштовую прадукцыю, заказаць тавары беларускіх вытворцаў і многае іншае ■

■ Навіны з рэгіёнаў

# БІЗНЕС-ПОШТА Ў ЦЭНТРЫ ГОМЕЛЯ

**Зала для абслугоўвання юрыдычных асоб адкрылася ў аддзяленні сувязі №48 Гомеля.**

Пра неабходнасць размежавання фізічных і юрыдычных асоб паштовыя работнікі задумаліся даўно. Ужо пяць гадоў таму ў буйных гарадах краіны, у тым ліку і ў Гомелі, з'явілiся першыя падраздзяленні «Бізнес-пошты» для абслугоўвання юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў. Цяпер на Гомельшчыне восем такіх пунктаў абслугоўвання розных кліенцкіх патокаў.

У першую чаргу гэта дазваляе палепшыць якасць абслугоўвання, скараціць нагрузку ў аддзяленнях паштовай сувязі. Атрымліваюць развіццё новыя сэрвісы і паслугі, якія арыентаваны на патрэбы карпаратыўных кліентаў: прыём дакументаў і тавараў да перасылання паштовымі адпраўленнямі ў «Бізнес-пошце» ці паштовым кур'ерам; прыём падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, грашовых пераводаў; рэалізацыя бланкаў строгай справаздачнасці і многае іншае.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** iost@zviazda.by ■

Матэрыялы паласы падрыхтавала **Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** lubneuskaya@zvizda.by

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
20 КРАСАВІКА 2017 г.
ЧАЦВЕР
№8 (15815)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Кірыл КРАСНЕЎСКІ:

# «Калі выступаеш за краіну, гэта ідзе ад сэрца»



**Валейбаліста нацыянальнай зборнай Кірыла Краснеўскага можна назваць самым вядомым беларускім «вандроўнікам» у гэтым відзе спорту. Да сваіх 29 гадоў ён паспеў пагуляць у васьмі краінах свету і выступіць за зборную роднай Беларусі на розных міжнародных турнірах. Дзе працягне сваю кар'еру далей, Кірыл яшчэ не вырашыў, ну а падчас аднаго са сваіх рэдкіх візітаў на радзіму ён расказаў у інтэрв'ю пра тое, ці лёгка спартсмену штогод мяняць месца жыхарства, прыгадаў, як прыйшоў у валейбол, і падзяліўся некалькімі гісторыямі з легіянерскага жыцця.**

***— Кірыл, ты з'ехаў гуляць за мяжу даволі рана...***

— Так, мне было 18. Тады вельмі хацелася паспрабаваць сябе ў замежным валейболе. Мне прапанавалі контракт адзін з клубаў Балгарыі, было страшна, але вырашыў ехаць. Напэўна, гэты першы вопыт і стаў для мяне самым складаным годам у кар'еры. У першую чаргу таму, што не ведаў мовы, але хутка яе вывучыў і зараз, дарэчы, выдатна памятаю балгарскую.

А пасля ў маёй кар'еры з'явіліся Грэцыя, Турцыя, Казахстан, Эстонія, Аўстрыя. У сёлетнім сезоне аказаўся ў Катары, а потым у Ізраілі. Пасля ад'езду ў 18 толькі год гуляў дома і не шкадую, на новым месцы мне падабаецца неяк больш — новыя людзі, новыя эмоцыі, новыя ўражанні. Ад кожнага трэнера я браў нешта карыснае для сябе, мне здаецца, менавіта так і фарміруецца вопыт у спартсмена.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

За кулісамі ЦТ

# САКРЭТЫ З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

## У чыіх руках знаходзяцца лёсы абітурыентаў?

**«Вашы машыны ацанілі маё дзіця няправільна!», «Чаму такі нізкі вынік? Напэўна, адбыўся нейкі тэхнічны збой?», «Заданні на цэнтралізаваным тэсціраванні выходзяць за рамкі школьнай праграмы! Яны некарэктныя. Ім бракуе творчасці!» Якія толькі абвінавачанні ні гучалі ў адрас Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў за гады правядзення ў нашай краіне ЦТ. Натуральна, што самы гарачы час для ўсіх супрацоўнікаў інстытута — чэрвень — пачатак ліпеня, калі з'яўляюцца першыя вынікі ЦТ. У сеціве тут жа распачынаюцца спробы іх аналізаваць, прычым кожны трактуе на свой капыл. А ў інстытут тэлефануюць абураныя бацькі, не згодныя з баламі, што атрымала дзіця. Асабліва калі рэпетытар даваў сям'і самыя аптымістычныя прагнозы...**

**Каб зрабіць увесь працэс падрыхтоўкі і правядзення ЦТ (ад стварэння тэстаў да апрацоўкі вынікаў удзельнікаў экзамену) максімальна празрыстым, Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў (РІКВ) рэгулярна арганізуе семінары для педагогаў на сваёй базе. Прайшло ўжо каля двух дзясяткаў такіх сустрэч. Нядаўна яго гасцямі сталі спецыялісты аддзелаў адукацыі, спорту і турызму Смаргонскага і Валожынскага райвыканкамаў і кіраўнікі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з гэтых раёнаў.**

### ТЭСТАЛОГІЯ — СУР'ЁЗНАЯ НАВУКА

— Хачу адразу расставіць кропкі над «і»: усе размовы аб тым, што змест нашых тэстаў выходзіць за рамкі школьнай праграмы, не адпавядаюць рэчаіснасці. Яшчэ ніхто не змог гэта даказаць... Проста ў тым выпадку, калі спроба паступлення маладога чалавека аказваецца няўдалай, вельмі зручна абвінаваціць тэсты ў празмернай складанасці ці некарэктнасці. Мяркую, што асобным рэпетытарам, школьным настаўнікам і нават некаторым бацькам выгадна падтрымліваць гэтыя міфы: рэпетытары і настаўнікі, чыя прафесійная годнасць пацярпела, апраўдваюць такім чынам сябе, а бацькі — нізкую канкурэнтаздольнасць сваіх дзяцей, — падкрэслівае **дырэктар РІКВ Мікалай ФЯСЬКОЎ**. — У нас многія лічаць, што яны ведаюць, як можна зрабіць працэдуру тэсціравання больш дасканалай, некаторыя патрабуюць унясення кардынальных змяненняў або ў тэхналогію, або ў арганізацыю цэнтралізаванага тэсціравання, або ў змест тэстаў. Але часцей за ўсё іх прапановы вельмі далёкія ад разумення гэтага пытання, бо тэсталогія — сур'ёзная навука.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Прайсці рэпетыцыйнае тэсціраванне, як камп'ютарнае, так і бланачнае, у Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў можна будзе да канца мая. Інструкцыі абітурыентам дае інжынер-праграміст Андрэй ГАЙДУК.**

Паміж праграмай уступных іспытаў і тэстам знаходзіцца спецыфікацыя, якая фарміруе, так бы мовіць, касцяк будучага тэста. У спецыфікацыі, якая распрацоўваецца для кожнай дысцыпліны, падрабязна прапісана ўся структура будучага тэста: колькасць заданняў у частках А і В, колькі прадугледжана заданняў на кожны раздзел вучэбнай праграмы, пералічаны ўсе вучэбныя элементы, што будуць кантралявацца. Спецыфікацыю ў свабодным доступе можна знайсці на сайце РІКВ.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

Размеркаванне

# А НА РАБОЦЕ — ДЗІЦЯЧЫ САДОК,

## або Навошта педагогу навыкі артыста?

**Пакідаючы сцены дзіцячага садка ва ўзросце шасці гадоў, Яўгенія Барабаншчыкава наўрад ці магла ўявіць, што вернецца сюды... у 21. Дзяўчына вучылася на настаўніка фізічнай культуры ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка, па размеркаванні адправілася ў родныя Смалявічы. Патрэбная вакансія знайшлася ў яслях-садзе №3. Ужо больш як паўгода суразмоўніца працуе тут кіраўніком фізічнага выхавання. Пра асаблівасці працы з самымі маленькімі дзецьмі яна расказала нашым карэспандэнтам.**


Фота Надзеі БУЖАН.

— Шчыра кажучы, амаль не памятаю, якой сама была ў дзіцячым садку, — смяецца Яўгенія. — Цікавасць да фізкультуры і спорту ў мяне з'явілася ўжо ў школе, нават хадзіла на дадатковыя заняткі. Займалася пераважна лёгкай атлетыкай, таксама ўдзельнічала ў спаборніцтвах. БДПУ выбрала таму, што там на спецыяльнасці «менеджмент у спорце і турызме» вучыўся мой старэйшы брат. Яму ўсё падабалася, таму я пайшла па яго слядах — на «фізкультурна-аздараўленчую і турысцка-рэкрэацыйную дзейнасць».

Дзяўчына сцвярджае, што вучыцца было цікава, хоць на першым курсе, як і кожны студэнт, яна сутыкалася з цяжкасцямі. Асабліва па профільных дысцыплінах, такіх як «лячэбная фізкультура». Але ўсё з лішкам кампенсавалася на практычных занятках. Будучыя настаўнікі вывучалі, у тым ліку і на практыцы, усе самыя папулярныя гульнявыя віды спорту і адзінаборствы. Акрамя таго, можна было выбраць для вывучэння іншыя кірункі, такія як лёгкая атлетыка, фітнес, аэробіка. Асобна вылучаліся спецыяльныя прадметы па педагогіцы, дзе студэнтаў вучылі тонкасцям працы з падрастаючым пакаленнем. Па словах дзяўчыны, на настаўнікаў фізкультуры ў БДПУ вучацца пераважна хлопцы...

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
20 04 2017 г.

# САКРЭТЫ З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Адна з галоўных пераваг ЦТ перад традыцыйным экзаменам — больш шырокі ахоп школьнага курса (прыкладна да 80 працэнтаў), у той час як на экзамене абітурыенту прапануюцца ўсяго 3—5 пытанняў.

— Але гэта зусім не азначае, што калі, умоўна кажучы, квадратных ураўненняў у нашых тэстах сёння няма, то і заўтра іх там не будзе, — папярэджвае ўсіх Мікалай Фяськоў. — Мы заўважылі, што калі тры-чатыры гады на ЦТ адсутнічаюць тыя ж квадратныя ўраўненні, то і настаўнікі ў школе перастаюць удзяляць ім належную ўвагу. Гэта іх памылка...

## БЕЗ ЗАЛІШНЯЙ УВАГІ І АЖЫЯТАЖУ

Пры стварэнні тэстаў улічваецца, што іх фармулёўкі і змест павінны быць лагічна карэктнымі, а адказы — адназначнымі і выключаць варыятыўнасць.

Аўтарамі тэстаў выступаюць высокакваліфікаваныя педагогі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, а комплексную ацэнку тэставым заданням даюць эксперты. І аўтары, і эксперты падпісваюць абавязацельства аб захаванні канфідэнцыяльнай інфармацыі тэрмінам на 10 гадоў і невыкарыстанні гэтай інфармацыі ў любым выглядзе, у тым ліку і для заняткаў рэпетытарствам.

— Яны не публічныя асобы, інакш бы вакол іх быў сапраўдны аншлаг, — усміхаецца Мікалай Фяськоў. — Я так сфармуляваў бы патрабаванні, якія прад'яўляюцца да экспертаў: гэта высокі прафесійны ўзровень плюс высокія маральныя якасці. Усіх экспертаў мы адбіраем на конкурснай аснове. Праводзім з імі папярэдняе сумоўе, прапануем нашы заданні, слухаем іх заўвагі і меркаванні. Чалавек, які прэтэндуе на ўключэнне ў інстытут экспертаў, павінен дасканала ведаць вучэбную праграму, працаваць у школе пэўны час і мець сваіх выпускнікоў, каб прайсці з імі ўсю школьную праграму ад пачатку і да канца. Адна з абавязковых умоў — ні аўтар, ні эксперт не маюць права займацца рэпетытарствам ці нейкай іншай формай падрыхтоўкі абітурыентаў, іхнія дзеці не павінны ў бягучым навучальным годзе планаваць паступленне ў ВНУ.

Экспертыза патрабуецца, па-першае, для таго, каб ацаніць адпаведнасць тэставых матэрыялаў патрабаванням праграм уступных іспытаў і зместу падручнікаў. Па-другое, каб ацаніць дакладнасць адлюстравання фактаў і падзей. Усе спрэчныя і суб'ектыўныя пункты гледжання, дапушчальныя ў навуцы, у тэстах выключаюцца. Акрамя таго, экспертамі правяраецца карэктнасць і лаканічнасць фармулёвак, мэтазгоднасць выкарыстання ілюстрацый і графічных выяў.

Мікалай Фяськоў падкрэслівае: «Паверце, што ніхто больш чым мы не зацікаўлены ў высокім прафесіяналізме аўтараў і экспертаў, таму што менавіта ад іх у рэшце рэшт і залежыць якасць нашых тэстаў. Тэставыя заданні — гэта ўсё ж такі не пытанні да параграфа ў падручніку...»

Наступны этап — апрабацыя тэставых матэрыялаў: гэта не толькі іх праверка на прыдатнасць і жыццяздольнасць, але і добрая магчымасць пазнаёміць будучых абітурыентаў з новымі заданнямі. Па выніках апрабацыі праводзіцца статыстычная апрацоўка вынікаў удзельнікаў тэсціравання і ацэньваецца якасць кожнага задання.

## ЧУЖЫЯ ТУТ НЕ ХОДЗЯЦЬ

Безумоўна, многіх цікавіць, а ці можа быць уцечка важнай інфармацыі з Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў яшчэ на стадыі падрыхтоўкі тэстаў?

— На кожны рух і кожнае дзеянне ў нашым інстытуце ёсць інструкцыя, як у ракетных войсках, — жартуе дырэктар. — Усе правілы, як паводзіць сябе ў той ці іншай сітуацыі, выпрацоўваліся гадамі. Папкі з рабочымі матэрыяламі, над якімі працуюць аўтары, захоўваюцца ў сейфе. Па кожным прадмеце працуюць два метадысты, кожны з іх мае сваю ячэйку і свой код. У пачатку рабочага дня яны бяруць свае папкі, а ў канцы дня абавязкова здаюць. Інфармацыя за сцены інстытута ніколі не выходзіць. Нават з калегамі ёй дзяліцца забаронена. Хоць, заўважу, што гэтыя матэрыялы яшчэ вельмі далёкія ад тых заданняў, што прапануюцца абітурыентам на ЦТ.

Ёсць у інстытуце пакой, так бы мовіць, святая святых, дзе захоўваецца ўся база тэставых заданняў за ўсе гады правядзення ЦТ.

— Гэта пакой з абмежаваным правам доступу. Каб трапіць туды, павінна сабрацца камісія ў складзе не менш як трох чалавек, — прыадкрывае заслону сакрэтнасці **начальнік вучэбна-метадычнага ўпраўлення РІКВ Аляксандр ЯКАБЧУК**. — У аднаго чалавека ёсць ключ ад гэтага памяшкання, у другога — права зняць сігналізацыю, у трэцяга — ключ ад сейфа, дзе захоўваюцца ноўтбукі па ўсіх 15 прадметах ЦТ. Кожны ноўтбук, акрамя таго, што змяшчаецца ў сейф, яшчэ і пламбіруецца. Свой уласны імянны пламбіратар ёсць у кожнага метадыста. Перад пачаткам работы ён правярае цэласнасць пломбы, заносіць інфармацыю ў журнал, зразае пломбу і прыступае да працы.



Задача верыфікатара — зверыць кожную літарку і кожную лічбу: ці правільна іх распазнаў камп'ютар. Кожны бланк праходзіць трайную праверку.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Пасля заканчэння ноўтбук зноў пламбіруецца. Ён цалкам абаронены ў плане інфармацыйнай бяспекі: ніколі не падключаецца нават да лакальных сетак, на апаратным узроўні ў ім адключана ўсё ўзаемадзеянне са знешнім светам. Часткова працуе толькі USB-порт — для таго, каб унесці ў базу новыя заданні ці штосьці раздрукаваць. І нават калі дапусціць, што ноўтбук аказаўся ў чужых руках, то доступу да базы даных зламыснік усё роўна не атрымае. Уся інфармацыя ў камп'ютары зашыфраваная, да таго ж і саміх тэстаў там няма. Яны фарміруюцца непасрэдна напярэдадні ЦТ у прысутнасці членаў дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў.

Запускаецца камп'ютарная праграма і ў аўтаматычным рэжыме фарміруюцца адразу некалькі тысяч варыянтаў тэстаў. Метадам сляпога выбару адбіраюцца 10 варыянтаў, якія і трапляюць на ЦТ.

**Кажуць, што лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць. Безумоўна, арганізаваць для ўсіх педагогаў, абітурыентаў і іх бацькоў экскурсію ў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў праблематычна. Але трапіць на віртуальную экскурсію можа кожны ахвотны. На сайце інстытута www.rikc.by прадстаўлены фільм «Пра ЦТ прадметна», з якога можна даведацца як пра факты з гісторыі тэсціравання ў свеце, так і пра ўсе акалічнасці стварэння тэстаў, захавання канфідэнцыяльнасці інфармацыі абсалютна на ўсіх этапах падрыхтоўкі і правядзення ЦТ і правілы паводзінаў, якія трэба ведаць будучым яго ўдзельнікам.**

## «ВИКТОРОВИЧЬ» І «ВЛАДЗИМЕРОВИЧЬ»

Сёння ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў вядзецца праверка работ удзельнікаў трэцяга этапу рэпетыцыйнага тэсціравання. Безумоўна, нават нельга параўноўваць цяперашнюю нагрузку на верыфікатараў з нагрузкай у разгар ЦТ.

— Мы знаходзімся на самым адказным і самым «гарачым» участку. На час ЦТ даводзіцца прыцягваць дадаткова на работу 250—300 студэнтаў. Яны працуюць у нас у тры змены па 4 гадзіны без выходных і святочных дзён, — уводзіць у курс справы **начальнік аддзела маніторынгу і методык кантролю Тамара БОЛТУЦЬ**. — На праверку работ па самай масавай дысцыпліне — рускай мове, якую здаюць да 75 тысяч чалавек, — у нас ідзе 8 дзён. Часта даводзіцца чуць ад усхваляваных бацькоў: «У майго дзіцяці дрэнны почырк, і ваша машына яго не прачытала...» Дарагія бацькі, почыркі абітурыентаў чытае не камп'ютар, а мы. Калі б усё даверылі тэхніцы, то была б сапраўдная бяда. А мы навучыліся разбіраць, напэўна, ужо ўсе магчымыя почыркі, але не думайце, што апаратар (верыфікатар), які сядзіць за камп'ютарам, можа нейкім чынам у праверку работ умяшацца. Пасля сканіравання ўсіх бланкаў электронная выява раздзяляецца на вобласць рэгістрацыі і вобласць адказаў. Адны нашы апаратары правяраюць толькі вобласць рэгістрацыі, а другія — толькі адказы і нават не ведаюць, чый бланк знаходзіцца перад імі на экране.

Задача верыфікатара — зверыць кожную літарку і кожную лічбу: ці правільна іх распазнаў камп'ютар. Кожны бланк праходзіць трайную праверку вачамі, і кожны раз яго «чытае» новы верыфікатар. Аператары выдаляюць і ўвесь бруд: напрыклад, абітурыент выпадкова чыркнуў ручкай, і, каб камп'ютар не залічыў яму няправільны адказ, мы гэта з элетроннай выявы прыбіраем. Здараецца, што абітурыент з-за хвалявання дзве літары напісаў у адной клетачцы. Мы іх таксама расстаўляем па сваіх клетках. Усё робім на карысць дзіцяці. Але хітрыкі, пра якія добра ведаем, не прапускаем... Пры гэтым камп'ютарная праграма фіксуе абсалютна ўсе ўмяшанні верыфікатара.

А казусы, па словах Тамары Болтуць, бываюць самыя розныя. Адзін абітурыент пры напісанні ўласнага імя, імя па бацьку і прозвішча дапусціў аж 7 памылак! Хтосьці піша на рускай мове «Викторовичь», а хтосьці — «Владзимеровичь». Фактычна ў кожным дзясятым бланку даводзіцца выпраўляць памылкі ў вобласці рэгістрацыі. Калі іх прапусціць, то памылка трапіць і ў выдадзены сертыфікат. Значыць, абітурыент будзе звяртацца па яго замену.

І яшчэ адзін важны момант — адказаў да тэставых заданняў апаратары не ведаюць. Яны рыхтуюцца толькі пасля таго, як работы ўдзельнікаў ЦТ прайшлі ўсе праверкі. Акрамя верыфікацыі (распазнавання рукапісных выяў) прадугледжаны яшчэ і тры апаратныя праверкі. Калі адказы нарэшце з'яўляюцца, яны ўносяцца ў камп'ютарную праграму і націсканнем адной кнопкі праз долі секунды з'яўляюцца ўсе 75 тысяч вынікаў. Хтосьці плача, а хтосьці — радуецца...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*



Рызографы для множання тэставых матэрыялаў аснашчаны лічыльнікамі арыгінал-макетаў і зробленых з іх адбіткаў. Ніводнага лішняга адбітку зрабіць немагчыма.

*Хачу на журфак!*

## Якое даём «імя»?

**Мы ўжо гаварылі пра тое, што для многіх нашых юных і маладых нештатных (а бывае, што і штатных) аўтараў даволі вялікай праблемай з'яўляецца выбар тэмы будучай публікацыі. Але бывае і так, што пачатковец або малады спецыяліст бліскуча спраўляецца з гэтай задачай, знаходзіць цікавага суразмоўцу, з творчым падыходам падае матэрыял, але агульнае станоўчае ўражанне крыху псуе адсутнасць у ім добрага загалоўка ці (калі трэба) падзагалоўкаў. Канешне, школьнік можа сказаць, што яго гэтаму навучаць пазней ва ўніверсітэце, і ў нечым будзе мець рацыю. Ды і рэдактары ў газеце, вядома, падправяць, дадумаюць патрэбнае за самога аўтара. З іншага боку, як мы ўжо неаднойчы падкрэслівалі, журналісцкі матэрыял — гэта не школьнае сачыненне, да такой «пробы пяра» прад'яўляюцца трохі іншыя патрабаванні. А вы ж марыце стаць калегамі па цэху, хочаце паступіць на журфак, так? Значыць, самы час павучыцца прыдумваць загалоўкі. Потым як знойдзеце, будзе чым здзівіць аднакурснікаў.**

Насамрэч загаловак — адна з вельмі важных частак матэрыялу, яго «імя», недаацэньваць якое нельга. Можна напісаць цудоўную публікацыю, але чытач папросту не заўважыць яе ў газеце, калі яго не «зачапіць», не прыцягнуць увагу. Памятаеце: якое імя вы яхце дасце, так яна і паплыве? Сваім загалоўкам вы як бы рэкламуеце ўвесь далейшы матэрыял, прымушаеце чытача не адрывацца ад тэксту. Адпаведна, ён не павінен быць «прэсным», агульным. Тое ж датычыцца і падзагалоўкаў — маленькіх загалоўкаў з тымі ж, што і ў асноўнага загалоўка, задачамі: інфармаваць і адначасова інтрыгаваць чытача. Загалоўкі і падзагалоўкі працуюць у адным тандэме, дапаўняючы адзін аднаго. («Ідэальны хмарачос», або Як разбіць агарод у цэнтры сталіцы».) На агульную справу скіравана і рубрыка. Гэта, умоўна кажучы, загаловак раздзела ці тэмы. Рубрыка звычайна карацейшая за загаловак і носіць больш шырокі характар, напрыклад, «Ідэі маладых». Можна дадаць крышачку экспрэсіі: «Хачу на журфак!»

Як прыдумаць крэатыўны загаловак? Мабыць, большасць аўтараў ідуць па такім шляху: напачатку трэба некалькімі словамі, адным невялікім сказам пераказаць сутнасць таго, што вы напісалі ў сваім матэрыяле. Напрыклад, «гэта аповед пра цікавага творцу» ці «размова з таленавітым навукоўцам». Цудоўна, вы на правільным шляху, але зрабілі пакуль толькі першы крок. Творца — панятак шырокае. Гэта і мастак, і паэт, і харэограф, і музыка. Гэтак жа як і сярод навукоўцаў могуць быць і хімікі, і аграномы, і ветэрынары. А калі размова пра фізіка? («Маркер» для лейкацытаў, ці Навошта фізіку паяльнік».) Стала цікава, што гэта за маркер і навошта той паяльнік? З агульнага загалоўка гэтага не вынікае, пра каго менавіта вы пішаце. Значыць трэба знайсці словы, якія будуць характэрныя толькі для гэтай прафесіі, спецыяльнасці ці занятку чалавека. («Асвоіць дуду можа амаль кожны».) Калі ўжыць слова «гліна», імаверна, што гаворка ідзе пра ганчара, рамесніка, праўда? А вось у слова «батман» больш тлумачэнняў. Калі вы пішаце пра балет, пажадана ў загалоўку ці падзагалоўку крыху расшыфраваць тэму, умоўна кажучы, словамі «пачка», «пуанты». Калі «батман» узяты з фехтавання, паспрабуйце ў кантэксце дадаць да яго словы «праціўнік» ці «клінок». Карацей кажучы, шукайце тэгі — ключавыя словы, з якіх потым і выбудоўвайце сваю канструкцыю загалоўка.

Калі вы прыдумваеце загалоўкі, іх памеры трэба суадносіць з аб'ёмам гатовага тэксту. Матэрыялу на старонку-другую патрэбна «імя» з двух-трох слоў («Бярозка» перамен не баіцца!»). І падзагалоўкі ў такім выпадку не абавязковыя. Большы па аб'ёме матэрыял вымагае як агульнага падзагалоўка, так і падзагалоўкаў па ўсім тэксце («Вучыўся на бюджэце? Вяртай даўгі! Што выпускнікам трэба ведаць пра размеркаванне», далейшыя падзагалоўкі: «Каго размяркуюць абавязкова?», «Куды можна размеркавацца? і г. д.).

Чаго не раю рабіць, дык гэта на месцы загалоўка першай справай пісаць слова «загаловак». Маўляў, потым прыдумаю. «Класіка жанру» — калі матэрыял па недаглядзе выходзіць у газеце з тым самым «загалоўкам».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Сам сабе спонсар*

# ПАСЛЯ ЎРОКАЎ — У ЗААПАРК

## Дзе школьніку зарабіць на марожанае?

**Атрымаць кішэнныя грошы можна не толькі за добрыя адзнакі. Служба занятасці гатова дапамагчы школьнікам знайсці падпрацоўку і на перыяд летніх канікул, і падчас навучальнага года. На які заробак можа разлічваць падлетак? І колькі гадзін павінен доўжыцца яго працоўны дзень?**

Сёлета сталічная служба занятасці плануе ўладкаваць на часовыя работы больш за чатыры тысячы падлеткаў. **Намеснік начальніка ўпраўлення занятасці насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Вікторыя УСОВІЧ** расказвае, што навучэнцы могуць заняцца прыбіраннем тэрыторыі, азеляненнем горада, рамонтна-будаўнічымі работамі, афармленнем памяшканняў. Усяго планueцца заключыць дагаворы больш чым са 180 аб'ектамі. Гэта школы, камунальныя прадпрыемствы, цэнтры пазашкольнай работы з моладдзю. Самае папулярнае месца працы ў саміх падлеткаў — заапарк. Там навучэнцам давяраюць дагледзець жывёл і нарыхтоўваць кармы.



Колькі ж можна зарабіць? Аплата вылічаецца ў адпаведнасці з мінімальным заробкам (на сёння гэта 265 рублёў) і залежыць ад колькасці фактычна адпрацаваных гадзін. Так, калі падлетак працаваў па будных днях па дзве гадзіны, то за месяц ён атрымае крыху больш за 66 рублёў. Гэта што датычыцца работ, арганізацыя якіх фінансуецца з бюджэту ў рамках праграмы часовай занятасці (напрыклад, добраўпарадкаванне школьнай тэрыторыі). Калі ж уладкавацца на вакансію, якую аплачвае наймальнік (мыйшчыкам посуду, укладчыкам, камплектоўшчыкам), можна зарабіць і ўдвая больш.

Па законе непаўналетніх хлапцоў і дзяўчат нельга прыцягваць да цяжкіх і начных работ, працы ў шкодных умовах. У вучэбны час школьнік ад 14 да 16 гадоў могуць працаваць у будны дзень максімум 2 гадзіны 18 хвілін, ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў — тры з паловай гадзіны. На летніх канікулах рабочая змена павінна доўжыцца не больш за 4 гадзіны 36 хвілін і 7 гадзін адпаведна.

Знайсці падпрацоўку падлеткі могуць і самастойна — у Агульнарэспубліканскім банку вакансій ці на сайце гарадскога камітэта ў раздзеле з часовымі работамі. Вікторыя Усовіч нагадвае: перш чым шчыраваць, трэба заключыць з наймальнікам працоўны дагавор, каб у выніку не застацца без грошай.

Дарэчы, школьнікам да 16 гадоў для ўладкавання, акрамя стандартных дакументаў (пашпарта, медыцынскай даведкі, даведкі з навучальнай установы) патрэбна яшчэ і пісьмовая згода аднаго з бацькоў.

Адметна, што з кожным годам ахвотных зарабіць у вольны ад урокаў час становіцца больш. Калі ў 2015-м з дапамогай сталічнай службы занятасці часовую падпрацоўку атрымалі 2,6 тысячы падлеткаў, то летась — амаль 4,3 тысячы.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*




# ДУМАЙ ГАЛАВОЙ!

**Брытанскія вучоныя з Кентскага ўніверсітэта даказалі, што падчас выкарыстання GPS-навігатараў вобласць чалавечага мозга, што адказвае за арыентаванне ў прасторы, адключаецца. Падобныя навіны часам выклікаюць шквал негатыўных эмоцый у сецібе. Маўляў, такія факты чарговы раз пацвярджаюць, што лічбавая рэвалюцыя робіць нас дурнейшымі ці як мінімум — больш лянівымі. Давайце разбірацца, ці сапраўды гэта так.**

Праблемы з мазгавой дзейнасцю ў вельмі прывязаных да новых тэхналогій людзей медыкі пацвярджаюць, ёсць нават спецыяльны тэрмін — «лічбавая прыдуркаватасць». Гэтымі словамі абазначаюць характэрную сімптаматыку моладзі ў многіх развітых краінах (напрыклад, у Паўднёвай Карэі, дзе ўзровень пранікнення ў жыццё інтэрнэту і новых тэхналогій вельмі высокі): слабую памяць, расстройства ўвагі, кагнітыўныя парушэнні, прыгнечанасць, дэпрэсію. Пішуць нават, што ў структуры галаўнога мозгу адбываюцца змяненні, аналагічныя наступствам чэрапна-мазгавых траўмаў і ранніх стадый дэменцыі. Спрошчана сітуацыя тлумачыцца тым, што запамінаць інфармацыю больш не трэба, усё можна імгненна «загугліць», праводзіць складаныя разлікі — таксама, бо калькулятары ёсць у камп'ютарах, смартфонах і іншых гаджэтах.

Сапраўды, у коле маіх знаёмых ёсць людзі, адмоўны ўплыў лічбавай рэвалюцыі на якіх заўважны простым вокам. Адны замест таго, каб трохі падвучыць англійскую мову, якая патрэбна ім для работы, прынцыпова карыстаюцца анлайн-перакладчыкам. Іншыя не надта імкнуцца развіваць свае кулінарныя здольнасці — любы рэцэпт можна імгненна адшукаць у інтэрнэце, а яшчэ прасцей у любы момант заказаць ежу з дастаўкай. Ды я сам не без граху — ва ўніверсітэце нярэдка замест чытання некаторых твораў перад парай знаходзіў у сецібе кароткі змест. Што там казаць — некаторыя нават пісаць ручкай развучыліся!

> **Дзецям варта нагадваць, што акрамя віртуальнага свету існуе рэальны, са сваімі правіламі і законамі.**

Але я сітуацыю не драматызаваў бы. Так, адны навукоўцы гавораць пра «лічбавую дэменцыю». Іншыя ж сцвярджаюць: новыя тэхналогіі не робяць наш мозг лянівым, а толькі вызваляюць яго рэсурсы, якія можна і трэба накіраваць на любую іншую дзейнасць, напрыклад, творчую, няхай сабе і пры дапамозе тых жа самых гаджэтаў. Менавіта ў гэтым, напэўна, і хаваюцца карані праблемы — беды пачынаюцца, толькі калі карыстацца ўсімі перавагамі лічбавай рэвалюцыі, але не даваць пры гэтым мазгам іншую працу.

Вось уявіце сабе чалавека, што ўвесь час «жыве» ў сецібе. Ён можа сутыкнуцца з непераадольнымі праблемамі, калі раптам страціць доступ да інтэрнэту. Напрыклад, кіроўца, які ўсё жыццё ездзіў толькі па навігатары, а потым аказаўся ў незнаёмым горадзе без яго. Ці зусім адарванага ад жыцця хлопца, што заблудзіў у лесе і не ведае, як вызначыць хоць бы бакі свету па навакольных прыкметах, каб зболшага зарыентавацца. Не думаю, што ў іх шмат шанцаў хутка выйсці з сітуацыі пераможцамі.

У Расіі зусім нядаўна на разгляд парламентарыяў быў унесены законапраект забароны карыстання сацыяльнымі сеткамі для дзяцей, якім меней за 14 гадоў. Ініцыятыва, безумоўна, памылковая: з аднаго боку, дзеці страцяць доступ да вялікага аб'ёму карыснай інфармацыі, а з другога, будуць адарванымі ад грамадства, вялікая частка стасункаў у якім адбываецца менавіта праз такія сэрвісы. Тым не менш пэўнае рацыянальнае зерне ў гэтай ідэі знайсці можна — дзецям сапраўды варта нагадваць, што акрамя віртуальнага свету існуе рэальны, са сваімі правіламі і законамі. Дарэчы, рабіць гэта можна ў тым ліку і пры дапамозе новых тэхналогій — на смартфонах цяпер хапае развіваючых праграм, а ў Швецыі гульню Minecraft (сімулятар выжывання, у якім гульцу трэба атрымліваць прадметы з рознага кшталту рэсурсаў) некалькі гадоў таму ўвялі ў абавязковую навучальную праграму адной са школ. Таму, як той казаў, на гаджэт спадзявайся, але і сам старайся.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

*Працоўны семестр*

# ЯКУЮ ВАКАНСІЮ ВЫБРАЦЬ?

**Студэнцкія атрады Мінска сёлета плануецца задзейнічаць на 160 аб'ектах. Па інфармацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама, для студэнцкай моладзі прадугледжана больш за 7,2 тысячы працоўных месцаў. Статус гарадской маладзёжнай будоўлі прысвоены цэнтру алімпійскай падрыхтоўкі па мастацкай гімнастыцы.**

У цэлым сёлета на арганізацыю часовай працоўнай занятасці моладзі будзе накіравана 924 тысячы рублёў з дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду (105,8 працэнта да 2016 года) і 130 тысяч рублёў з гарадскога бюджэту (138,4 працэнта). Сфарміраваны банк вакансій для навучэнцаў і студэнтаў. Пры гарадской арганізацыі БРСМ пачаў работу штаб працоўных спраў па падборы і выдачы вакансій для працаўладкавання моладзі. Летась студэнты працавалі на 213 аб'ектах, статус маладзёжнай будоўлі прысвойваўся праекту рэканструкцыі стадыёна «Дынама», дзе ў тым ліку працаваў міжнародны беларуска-расійска-ўкраінскі будаўнічы студэнцкі атрад. Усяго было сфарміравана 203 будаўнічыя, 21 сельскагаспадарчы, 84 педагагічныя, 34 экалагічныя і 420 сэрвісных атрадаў. У параўнанні з 2015 годам колькасць працаўладкаванай моладзі ўзрасла на 46,5 працэнта.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

*Эх, хутчэй бы лета!*

# Лагер за горадам, змена чаканая...

**Каля 66,2 тысячы юных мінчан адпачнуць на летніх канікулах у дзіцячых аздараўленчых лагерах.**

Па інфармацыі Мінскага гарадскога ўпраўлення Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва, у лагерах з кругласутачным знаходжаннем адпачнуць 38,3 тысячы дзяцей (з іх у 9-дзённых палатачных лагерах — 7 тысяч) і каля 27,9 тысячы хлопчыкаў і дзяўчатак — у лагерах з дзённым знаходжаннем. Гэтым летам будуць працаваць 32 стацыянарныя загарадныя аздараўленчыя лагеры, звыш 400 лагераў з дзённым знаходжаннем і 200 палатачных і профільных лагераў. Работа лагераў з кругласутачным знаходжаннем будзе арганізавана ў наступных рэжымах: тры лагеры — у пяць змен, 27 лагераў — у чатыры змены і два лагеры — у тры змены. Працягласць змен складае ад 18 да 21 дня. Асаблівую ўвагу, як і ў папярэднія гады, удзеляць аздараўленню дзяцей-інвалідаў, дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, з сацыяльна небяспечных сем'яў. Акрамя таго, плануецца арганізаваць больш за 50 лагераў працы і адпачынку з дзённым і кругласутачным знаходжаннем. Імі будуць ахоплены больш як 1,3 тысячы сталічных школьнікаў.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

*Нябачныя масты*

# Мацнеюць сувязі з Азербайджанам

**Дні моладзі гэтай краіны прайшлі ў Беларусі. Цэнтральнай сустрэчай насычанай праграмы знаходжання азербайджанскай дэлегацыі на нашай зямлі стала сустрэча з міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь Ігарам КАРПЕНКАМ.**



— Паміж Рэспублікай Беларусь і Азербайджанскай Рэспублікай традыцыйна складваюцца цёплыя адносіны. Яркае пацвярджэнне таму — правядзенне Дзён моладзі дзвюх краін, якія сталі сапраўдным святам сяброўства і ўзаемаразумення, — падкрэсліў Ігар Карпенка. — Для нас, як, упэўнены, і для Азербайджана, пытанні дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі заўсёды будуць вельмі важнымі, таму што кожная дзяржава задумваецца над тым, у якім напрамку будзе далей развівацца грамадства, якой будзе яго сацыяльна-эканамічная мадэль.

Па словах Ігара Карпенкі, у Беларусі сёння назапашаны багаты вопыт дзейнасці студэнцкіх атрадаў, якім мы гатовы дзяліцца з калегамі, і мы гатовы прыняць студэнцкую моладзь Азербайджана ў нашых студатрадах.

Падчас дыялогу з міністрам адукацыі абмяркоўваліся пытанні навучання грамадзян дзвюх дзяржаў, сумеснага прызнання дакументаў аб адукацыі, узаемадзеяння студэнтаў дзвюх краін у сферы навукі, сістэма грантаў, удзел моладзі ў прыняцці рашэнняў у сферы маладзёжнай палітыкі. Беларускіх студэнтаў цікавіў таксама вопыт падрыхтоўкі азербайджанскіх спартыўных валанцёраў да першых Еўрапейскіх гульняў, якія прайшлі ў Баку ў 2015 годзе. Наступныя гульні, як вядома, пройдуць у 2018 годзе ў Беларусі.

На сённяшні дзень паміж установамі вышэйшай адукацыі дзвюх краін ужо заключаны і рэалізоўваюцца 19 міжнародных дагавораў, у рамках якіх ажыццяўляюцца сумесныя навуковыя, педагагічныя і адукацыйныя праекты. Важнай падзеяй стала ўключэнне ў 2012 годзе чатырох вядучых беларускіх ВНУ ў Дзяржпраграму навучання азербайджанскай моладзі за мяжой. Распрацаваны праект стварэння ў Азербайджане рэсурсных цэнтраў пачатковай прафесійнай адукацыі будаўнічага і машынабудаўнічага профіляў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
20 04 2017 г.

# А НА РАБОЦЕ — ДЗІЦЯЧЫ САДОК...


Фота Надзеі БУЖАН.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Пасля чатырох гадоў навучання занялася пошукам месца для размеркавання, — успамінае Яўгенія. — Прыйшла ў аддзел адукацыі, а там прапанавалі работу ў садку. Я спачатку спужалася: як гэта, працаваць з зусім маленькімі дзеткамі? Цяпер магу з упэўненасцю сказаць, што гэта асаблівая праца. Тут і час занятку зусім невялікі, і падыход да дашкольнікаў патрэбны адмысловы. Я, безумоўна, чытала тэарэтычныя дапаможнікі, шукала інфармацыю, але найбольш сваімі практычнымі парадамі мне дапамагла Ала Канстанцінаўна Марусіч, якая працуе тут даўно. Што датычыцца аднагрупнікаў, то яны ў асноўным размеркаваліся настаўнікамі ў школы ці трэнерамі ў спартыўныя вучылішчы.

**«Калі параўноўваць са школьнікамі, то працаваць прасцей: у маленькіх дзяцей аўтарытэт дарослага бясспрэчны».**

Працоўны дзень кіраўніка фізвыхавання пачынаецца рана — ужо ў 7.30 трэба праводзіць зарадку ў шасці замацаваных за ёй групах. Пасля пачынаюцца заняткі: спачатку ў малодшых дзяцей, потым у старэйшых. Яны прыкметна адрозніваюцца ад заняткаў у школе. Па-першае, усё робіцца пад музыку, якую спецыяльна падбіраюць выхавацелі. Па-другое, сур'ёзную нагрузку маленькім дзецям даваць нельга — усё грунтуецца на падтрыманні фізічнай формы. Акрамя гэтага, вялікі акцэнт робіцца на гульні. Пасля абеду пачынаюцца гурткі: рытмапластыка, элементы сучаснага танцу. У канцы дня — «папяровая праца», якой, па прызнанні Яўгеніі, нямала: план-канспекты на кожны занятак, планаванне актыўнага адпачынку, дадатковых зарадак... Гэта, па словах маладога спецыяліста, найменш прыемны аспект работы. Дарэчы, часам даводзіцца асвойваць і тое, чаму не вучылі ў ВНУ, напрыклад, акцёрскую справу. На кожным ранішніку выхавацелі атрымліваюць свае ролі, вучаць тэкст. Так, на Новы год Яўгенія была Снягурачкай.

— У кожнай групе больш за дваццаць дзяцей, і трэба ўсіх па імёнах ведаць, — смяецца Яўгенія. — Калі параўноўваць са школьнікамі (а я падчас вучобы практыкавалася ў старэйшых класах), то працаваць прасцей: у маленькіх дзяцей аўтарытэт дарослага бясспрэчны. Мяркую, што у школе фізкультуру прасцей весці мужчынам, а ў садку — нам.

Маладому выхавацелю ў дзіцячым садку даверваюць, пра гэта сведчыць хоць бы той факт, што менавіта яе ўсяго праз паўгода працы адправілі на раённае метадычнае аб'яднанне — там Яўгенія прадстаўляла калегам сваю рэалізацыю заняткаў на стэпах (спецыяльных мабільных пляцоўках для фітнесу). Гэта задумка не ўваходзіць у асноўную праграму навучання, а прапаноўваецца як дадатковая паслуга ахвотным бацькам. Працуючы на паўтары стаўкі, дзяўчына зарабляе каля 400 рублёў. Для такога горада, як Смалявічы, гэта неблагія грошы. Адзінае, на што наракае малады спецыяліст, — для адпачынку тут няма вялікіх магчымасцяў.

**Па-першае, усё робіцца пад музыку, якую спецыяльна падбіраюць выхавацелі. Па-другое, сур'ёзную нагрузку маленькім дзецям даваць нельга.**

У вольную хвіліну яна звычайна адпраўляецца на стадыён або ў спартзалу.

— У чым плюсы і мінусы маёй работы? — перапытвае дзяўчына. — Самая вялікая перавага — праца з дзецьмі. Яны эмацыянальныя, заўсёды шчырыя. Прыходзіш у панядзелак на работу, бачыш іх усмешкі — і настрой падымаецца. Але гэта можна залічыць і да мінусаў — усё ж такі ад пастаянных стасункаў з дзецьмі хутка стамляешся. Я лічу сваю працу выдатным досведам. Адзінае, калі цяпер пайсці працаваць у школу, давядзецца наноў усё ўспамінаць. Але я сыходзіць не планую, пакуль што мяне ўсё задавальняе.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*
*Мінск — Смалявічы — Мінск.*

*І сабе, і людзям*

## Моладзь — за новыя тэхналогіі

**Трэці год запар у фінале рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» ўдзельнічаюць навучэнцы Маладзечанскага гандлёва-эканамічнага каледжа. У 2015 годзе яны прадставілі праграмны прадукт Create Pit («Памочнік дыетолага»). Летась — адразу дзве мабільныя праграмы.**


**Аляксандр Стэфановіч і Дзмітрый Каспяровіч.**

Сёлета гонар сваёй установы адстойваюць навучэнцы чацвёртага курса спецыяльнасці «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» Дзмітрый Каспяровіч і Аляксандр Стэфановіч. Юныя праграмісты пад кіраўніцтвам выкладчыкаў Зоі Зянько, Марыі Манюк і Вольгі Цыганок распрацавалі спецыяльную мабільную праграму «Music GO» для смартфона або планшэта на платформе Android/IOS, якая дазволіць слухаць музыку за невялікую плату, прычым без выкарыстання інтэрнэт-трафіка.

